ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 80 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

Падпіска і абвестні прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-61.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. „здатку".

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . . . . 10-74
Сакратар . . . . 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

СУБОТА, 2 жніўня 1930 г.
№ 178 (3776)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

## Баявыя першажніўеньскія выступленьні ва ўсіх куткох зямное кулі

### ПА ПРАДПРЫЕМСТВАХ РАСКЛЕЕНЫ ПЛЯКАТЫ І АДОЗВЫ

ВЕНА, 31. Як паведамляюць з Будапэшту, у рабочых раёнах гораду і на прадпрыемствах расклеены плякаты і адозвы з заклікам прымаць удзел у першажніўеньскіх дэманстрацыях. Антываенныя праклямацыі, якія заклікаюць да абароны СССР, распаўсюджваюцца таксама сярод салдат.

### УЗМОЦНЕНА РЫХТУЮЦЦА

ВЕНА, 31. Як паведамляюць з Будапэшту, лік арыштаваных там рэвалюцыйных рабочых, якія прымаюць актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да першажніўеньскіх выступленьняў дасягнуў 80.

Як ужо паведамлялася, у ліку іншых арыштаваны рэдактар адзінай у Вэнгрыі марксыцкай літаратурнай часопісі «100 проц.» Тамош. Вэнгерская охранка цяпер заяўляе, што пры разглядзе знойдзенага ў Тамоша матар'ялу яна, нібы, выкрыла довады сувязі Тамоша з органам нямецкай камуністычнай партыі, «Ротэ Фанэ» і фінансаваньне Тамоша гэтай газэтай. Будапэшцкая паліцыя паладзіла сувязь з бэрлінскай для сумеснага расьсьледваньня гэтай справы. Адначасова вэнгерская паліцыя звярнулася да паліцыі іншых краёў з прапановай правесьці сумесна мерапрыемствы супроць першажніўеньскіх выступленьняў.

### ЗАКЛІК ДА ДЭМАНСТРАЦЫЙ І ПАЎСТАНЬНЯЎ

ПАРЫЖ, 31. Паводле вестак з Інда-Кітаю, у галоўных цэнтрах Інда-Кітаю за апошнія дні было распаўсюджана вельмі многа першажніўеньскіх праклямацый, якія заклікаюць да дэманстрацый і паўстаньняў. Згодна гэтага паведамленьня, паліцыі ўдалося арыштаваць тых, хто распаўсюджваў праклямацыі, а таксама «важных агітатараў», якіх падазраваюць у падрыхтоўцы да першажніўеньскіх выступленьняў. Інда-кітайскія ўлады прымаюць меры, патрэбныя для «падтрыманьня парадку» 1-га жніўня.

Дзень пралетарскай салідарнасьці ў Нямеччыне

### «САЛДАТЫ, ДЭМАНСТРУЙЦЕ З КАМУНІСТЫМІ»

ВЕНА, 31. Аўстрыйская паліцыя вельмі рыхтуецца да задушэньня першажніўеньскіх выступленьняў. У рабочых раёнах Вены паліцыя арыштоўвае камуністых, якія распаўсюджваюць агітацыйныя матар'ялы да 1-га жніўня. Арыштаваныя дапытваюцца па мэтадах румынскай охранкі: іх зьбіваюць і катуюць. У рабочым раёне Вены Мэдлінг камсамольцы наладзілі дэманстрацыю перад казармамі з лёзунгамі: «Салдаты, дэманструйце 1-га жніўня з камуністымі супроць фашысцкага ваеннага закону, у абарону Савецкага Саюзу».



Антываенная дэманстрацыя у Бэрліне

### ПРАТЭСТУЕМ СУПРОЦЬ АНТЫСАВЕЦКАГА ЦКАВАНЬНЯ

ВЕНА, 1. Дэлегацыя, аўстрыйскіх чыгуначнікаў, у большасьці сацыял-дэмакратаў, якая нядаўна вярнулася з СССР, апублікавала адозву да рабочых і сялян Савецкага Саюзу. Аўстрыйскія чыгуначнікі заяўляюць, што рабочая клясa СССР дабілася «посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама ў правядзеньні 7-мігадзіннага рабочага дня, росту рэальнай заработнай платы, узмацненьня культурнай работы, дзякуючы рабоце камуністычнай партыі і прафсаюзаў СССР і іх непарыўнай сувязі з працоўнымі масамі СССР». У сваім лісьце дэлегацыя пратэстуе таксама супроць антысавецкага цкаваньня, яное праводзіцца Амстэрдамскім Інтэрнацыяналам.

### КАМУНІСТЫЧНЫЯ ПРАКЛЯМАЦЫІ Ў РАБОЧЫХ РАЁНАХ

ВЕНА, 31. Паводле вестак з Сафіі, там апублікавана спэцыяльнае абвяшчэньне сафійскай камэндатуры, якое забаранае ўсякія выступленьні і забастоўкі 1-га жніўня. Камэндатура заяўляе, што ўсякія дэманстрацыі і групы на вуліцах, плошчах, перакрываньнях вуліц і садох ад 30 ліпеня па 1-е жніўня ўключна будуць рашуча разганяцца. Уласьнікі фабрык заводаў і майстэрань абавязаны паведаміць паліцыі прозьвішчы рабочых, якія ў гэтыя дні ня зьявяцца на работу. У Сафіі закрыты на 1-е жніўня ўключна ўсе рабочыя клюбы. Ня гледзячы на паліцэйскі тэрор, у рабочых раёнах распаўсюджаны камуністычныя праклямацыі, якія заклікаюць да абвяшчэньня забастовак 1-га жніўня.

### *Шматтысячная дэманстрацыя ў Бэрліне*

БЭРЛІН, 1. У Бэрліне адбылася арганізаваная нямецкай кампартыяй антываенная дэманстрацыя. Дзесяткі тысяч дэманстрантаў накіраваліся праз рабочыя кварталы ў буржуазную частку Бэрліну. На чале калён ішлі атрады матацыклістых з чырвонымі сьцягамі.

### *Масавыя арышты ў Польшчы*

ВАРШАВА, 1. Сёньня, чакаючы рабочых дэманстрацый, уся Варшаўская паліцыя на нагах, узброеная газавымі бомбамі. З правінцыі паведамляюць аб масавых арыштах, у сувязі з днём 1-га жніўня. У афіцыяльным паведамленьні гаворыцца, што паліцыі ўдалося ў Сасновіцах арыштаваць акруговы камітэт польскай кампартыі.

### *Паліцыя зьбівае беспрацоўных*

ПРАГА, 1. На мітынгу беспрацоўных з прамовамі аб 1-м жніўня выступілі ка муністычны сэнатар т. Нядзьведзь і камуністка-дэпутатка т. Чыжынская. Паліцыя груба накінулася на беспрацоўных. Тав. Чыжынская пры арышце зьбіта паліцыяй.

### ВОБЫСКІ, АРЫШТЫ І КАНФІСКАЦЫІ

ВЕНА, 31. Паводле афіцыйных вестак з Бухарэсту, у Румыніі забаронены дэманстрацыі 1-га жніўня. Ва ўсіх прамысловых цэнтрах краю зроблены масавыя вобыскі і арышты і канфіскаваны першажніўеньскія плякаты і літаратура.

### РАБОЧЫЯ АКАЗАЛІ СУПРАЦІЎЛЕНЬНЕ

АТЭНЫ, 31. У сувязі з 1 жніўня на тры дні забаронен выхад камуністычнай газэты «Рызаспастыс» і забаронены мітынгі пад адкрытым небам. Для арганізацыі мітынгаў у закрытых памяшканьнях трэба ўзбудзіць хадайніцтва за тры дні. На многіх прадпрыемствах у Атэнах адбываліся сходы рабочых, прысьвечаныя 1-му жніўню. Спробы распаўсюджаньня адозваў у ваколіцах Атэн жандармэрыя спыняла ўсімі сродкамі, аж да страляніны ў паветра. Арыштавана двое рабочых, якія распаўсюджвалі адозвы. Пры арышце рабочыя аказалі супраціўленьне.

### МАСАВЫЯ МІТЫНГІ І ДЭМАНСТРАЦЫІ

ЛЕНДАН, 1. З 7-мі гадзін раніцы—яшчэ да пачатку работ—на фабрыках і заводах адбыліся кароткія мітынгі, на якіх выступаўшыя прамоўцы тлумачылі значэньне міжнароднага дня барацьбы супроць імпэрыялістычнай вайны. Адбыліся таксама дэманстрацыі ў кожнай раённай біржы працы. У кожнай з гэтых дэманстрацый прымала ўдзел ад 300 да 1.000 чал. Беспрацоўныя наведалі буйнейшыя заводы і прадпрыемствы, дзе ў часе абедзенага перапынку адбыліся масавыя мітынгі з удзелам рабочых і беспрацоўных.

У прынятых рэзалюцыях падкрэсьліваецца патрэбнасьць салідарнасьці ўсіх рабочых у змаганьні супроць імпэрыялістычнай вайны і за абарону Савецкага Саюзу. Усюды былі згуртаваны вялікія папідзійскія сілы.

### НА ВУЛІЦАХ БРАНЯВІКІ

ШАНХАЙ, 1. Сёньня ў Шанхаі, як заўсёды ў дні баявых рабочых дэманстрацый, усе вуліцы з раніцы заняты шматлікімі атрадамі паліцыі. Апроч таго, каб запалохаць шанхайскіх рабочых і тубыльцаў, на горадзе «дэманстрацыйна» разьязджаюць японскія бранявікі і ваенныя матацыклы. Дэманстрацыі энэргічна разганяюцца паліцыяй. Паводле першых вестак, ужо зроблена каля 20 арыштаў.

## У фашысцкай Польшчы

### Посьпехі нашага замежнага гандлю моцна ўдарылі па польскіх цьвёрдалобых

ВАРШАВА, 27. Орган кансэрватараў (пілсудчыкаў) «Наша ппыслоссьць» (Наша будучыня), які дэбатаваў у 6-м нумары артыкулам аб адрыве Украіны ад СССР, выступае цяпер з артыкуламі зусім іншага характару. Артыкул пад назваю «Бальтыцкае і Чорнае мора», прысьвечаны праекту сыстэмы каналаў, якая злучала б Бальтыцкае мора з Чорным праз Віслу, Буг, Прыпяць і Дняпро. Аўтар артыкулу горача абараняе праект набудовы гэтага воднага шляху, у якім па яго думцы, «кроўна зацікаўлены як Савецкі Саюз, так і Польшча». «Самы факт гаспадарчае згоды паміж Польшчай і СССР,—піша газэта,—на глебе арганізацыі шляхоў зносін, якія маюць міжнароднае значэньне, будзе куды лепш спрыяць ўміратварэньню Эўропы, чым розныя гарантыйныя пакты.

Цьвёрдай асновай ў адносінах Польшчы з СССР зьяўляецца разьмежаваньне паняцьцяў: Камінтэрну і савецкага ўраду. Няма такіх рэпрэсій, якія не маглі б быць апраўданы ў змаганьні з бальшавікамі ў Польшчы. Зусім аднак, іншая справа афіцыйныя адносіны Польшчы да савецкага ўраду. Калі Польшча хоча рэальна разглядаць свае ўзаемаадносіны з СССР, дык яна павінна стаць толькі на пункт погляду разьмежаваньня паняцьцяў Камінтэрну і савецкага ўраду. Такім чынам будуць створаны прынцыповыя дыпляматычныя ўзаемаадносіны, мабыць, будзе нават змаганьне, але змаганьне аднолькавай зброяй». «Супрацоўніцтва ня толькі магчыма,—піша далей газэта,—але і патрэбна ў першую чаргу на глебе агульных водных шляхоў. СССР ня менш зацікаўлена ў міжнародным пераходзтве па Дняпры, чым Польшча».

Вельмі характэрна, што афіцыёз «Газэта польска» у працягу некалькіх тыдняў вяла нядаўна кампанію супроць аднаго з лідэраў нацыянал-дэмакратаў Трамчынскага за тое, што апошні вёў на гэую-ж тэму «аб канале з Бальтыцкага ў Чорнае мора» гутаркі з пабопчыкам т. Войкавым. Трамчынскі абвінавачваўся ва ўсіх сьмяротных грахох. Яго называлі ледзь ня эдраднікам, савецкім агентам. (ТАСС).

### Колькі даўгоў мае Польшча

У той час, калі фашысцкая Польшча б'ецца ў сударгах эканамічнага крызісу, калі кожны трэці рабочы зьвуляецца беспрацоўным, калі сотні тысяч рабочых і іх сем'яў галадаюць, — польскія фашысты мільярды трацяць на падрыхтоўку вайны супроць СССР. Няма таго тыдню, каб у Данцыгскі порт або ў Гдыню ня прыходзіў параход са зброяй і амуніцыяй для Польшчы. Калі імпэрыялістыя і адмаўляюць Польшчы ў крэдытах, з прычыны напружанага ўнутранага становішча і нявызначанасьці ў заўтрашні дзень, дык затое французкі імпэрыялізм узбройвае свайго васаля — Польшчу да зубоў у доўг. Растуць дзяржаўныя даўгі фашысцкай Польшчы. «Газэта Польска» ў адным з сваіх апошніх нумароў на падставе справаздачы камісіі кантролю дзяржаўных даўгоў падае, што Польшча на 1 ліпеня бягучага году вінавата была: Амэрыцы — 311.834.578 долараў і 1.800.000 фунтаў стэрлінгаў; Францыі—1.072.313.493 французскіх франкаў; Англіі — 4.253.970 фунтаў стэрлінгаў; Італіі — 354.272.000 лір; Галяндыі — 3.417.000 крон; Нарвэгіі — 17.588.000 крон і 312.000 фунтаў стэрлінгаў; Даніі — 376.250 крон дацкіх; Швэцыі — 6.370.790 крон шведзкіх і 4.650.000 долараў; Швэйцарыі — 78.750 франкаў швэйцарскіх; Чэхаславакіі — 171.000 франкаў швэйцарскіх і Аўстрыі — 335.000 шылінгаў аўстрыйскіх.

### Антысавецкая правакацыя ў Амэрыцы

#### ПАЛІЦЫЯ ПРАЦЯГВАЕ КАМПАНІЮ

НЬЮ-ЁРК, 30. Нью-ёркская паліцыя працягвае кампанію, у сувязі з дзейнасьцю камісіі Фіша. Паліцыя заяўляе, што яна працягвае пошукі «штабкватэры ЧК АДПУ» ў Нью-Ёрку. Паліцыя зрабіла налёт на адну з аптэк ва ўсходнім квартале Нью-Ёрку. Аптэка належыць нейкаму Шафрану (сыну арыштаванага за кантрабандны праваз гадзіньнікаў і высунутага абвінавачаньне супроць Амторгу). Пасьля вобыску ў аптэцы паліцыя заявіла, што яна не знайшла ніякіх сьлядоў ні ЧК, ні АДПУ.

#### ФІШ «ЗАМАРЫЎСЯ»

НЬЮ-ЁРК, 30. Камісія Фіша раптам адклала працяг сваіх пасяджэньняў у Чыкага, заявіўшы, што накіроўваецца ў Вашынгтон, дзе яна абвясьціць перапынак у сваіх работах.

#### «ЭКСПАРТЭРЫ» НЕПАКОЯЦЦА

НЬЮ-ЁРК, 30. «Зьлёт экспартэраў Нью-Ёрку» склікае нараду сваіх членаў. Шмат кіраўнікоў экспартных арганізацый непакоюцца што Амторг спыніць закупкі ў ПАЗШ, а магчыма і зусім пакіне край.

#### БЕЛЫ ДОМ НІБЫ СУПРОЦЬ

НЬЮ-ЁРК, 30. Паводле апошніх даных Белы Дом (рэзыдэнцыя Гувэра) выказваецца супроць агульнай забароны ўвозу савецкіх тавараў, паказваючы, што ПАЗШ не дапускаюць іх тавары, вырабленыя зьняволенымі, але адносяцца адмоўна да спроб апаганеньня Савецкага Саюзу.

### 1/5 *рабочых—бяз працы*

НЬЮ-ЁРК, 31. Згодна паведамленьню старшыні амэрыканскай фэдэрацыі працы Вільямса Грына, беспрацоўныя ў ліпені месяцы ў ПАЗШ складалі 21 проц. усіх рабочых ПАЗШ.

#### ПРЫМУШАНЫ ПРЫЗНАЦЬ

ВАШЫНГТОН, 30. У той час, як некаторыя газэтныя паведамленьні цьвердзяць, што Савецкі Саюз дапамагае кітайскім камуністым, якія вядуць ваенныя апэрацыі ў правінцыі Хунань, дзяржаўны дэпартамэнт ПАЗШ сёньня заявіў, што няма довадаў існаваньня сувязі паміж рускімі камуністымі і кітайскімі, якія вядуць у сучасны момант барацьбу з панкінскай арміяй у Хунані. Няма таксама довадаў, што Савецкі Саюз дапамагае кітайскім камуністым.

## ЗА СІЛАС

### На сіласным фронце яшчэ няма ніякіх зьмен

### ДАЛЕЙ ТАК БЫЦЬ НЯ МОЖА

*Выканаць плян сіласаваньня*

### Кожная тона сіласу—удар па кулаку

З месц паступаюць трывожныя весткі. Ва многіх акругах сіласны дзесяцідзёньнік праходзіць зусім нездавальняюча. Камсамол, зямельна-каапэрацыйныя органы, калгасныя арганізацыі яшчэ не дабіліся відавочнага зруху на сіласным фронце. Паранейшаму на шляху сіласаваньня стаяць сур'ёзныя перашкоды. Сілас дзе-ні-дзе яшчэ знаходзіцца ў палоне ганебнай цяганіны, ведамсьцьвенных спрэчак, безадказнасьці і бюракратызму.

Дзе-ні-дзе ўсё больш выразна чуцны галасы, што «наогул з сіласаваньня нічога ня выйдзе», што «плян сіласаваньня праведены, больш нічога зрабіць нельга» і таму падобныя панікёрскія енкі.

Хіба ня ясна, што такое панікёрства, такія капітулянцкія скавытаньні толькі на руку кулаку, які шалёна прабуе атакаваць фронт жывёлагадоўлі. Мы бачым як асобныя калгасы, якія на-бальшавіцку ўзяліся за работу, з посьпехам канчаюць будаўніцтва сіласных вежаў і ям і прыступаюць да сіласаваньня зялёнае масы. Аб посьпехах арцеляй «Расьсьвет - Пераможца» і «Прамень Камуны» (гл. карэспандэнцыю з Бабруйску, зьмешчаную ніжэй) павінны ведаць усе калгасы Беларусі. Шляхам сацыялістычнага спаборніцтва калгасьнікі арцеляй «Прамень Камуны» і «Расьсьвет-Пераможца» дабіліся свяцасовага і поўнага выкананьня плянаў сіласнага будаўніцтва. Гэтыя калгасы пабудавалі ўжо вежы і ямы, у якіх можна засіласаваць каля тысячы тон сіласнай зялёнай масы. На дасягнутых посьпехах калгасьнікі не супакоіліся. Яны прыступілі да будаўніцтва новых вежаў і ям і, як нам паведамляюць, гэта будаўніцтва праходзіць добра.

Які яшчэ іншы патрэбен адказ бюракратам і капітулянтам, якія ў адзін голас енчаць, што «плянаў сіласаваньня кармоў выканаць нельга», што «сіласаваньне—справа новая і немагчымая». Прыклад калгасаў «Расьсьвет Пераможца» і «Прамень Камуны» бліскуча даводзіць якіх вялікіх посьпехаў можна дабіцца пры разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва, пры ўдарных мэтадах работы.

Такімі мэтадамі павінны працаваць усе калгасы. Наперакор усякім панічным енкам, наперакор бюракратам, трусам і малаверам мы будзем з усёй бальшавіцкай упартасьцю змагацца за сілас—магутны трактар жывёлагадоўлі.

Даб'ёмся рашучага і неадкладнага пералому ў ходзе сіласнага дзесяцідзёньніка. Ліквідуем усе прарывы па сіласным фронце і поўнасьцю выканаем пляны сіласнага будаўніцтва. Слова за партыйнымі арганізацыямі, камсамолам, усёй грамадзкасьцю. Мы павінны цьвёрда ўсьвядоміць, што барацьба за сілас ёсьць барацьба за вырашэньне праблемы жывёлагадоўлі. Мацней ударым па кулаку, які прабуе атакаваць жывёлагадоўчы вучастак нашага будаўніцтва, па правых апартуністых, якія забываюць пра сілас—трактар жывёлагадоўлі.

Уборка ўраджаю ў саўгасе «Прылукі»

### БАБРУЙСКАЯ РАБОТА

БАБРУЙСК (НАШ КАР). КАЛГАСЫ «РАСЬСЬВЕТ—ПЕРАМОЖЦА» І «ПРАМЕНЬ КАМУНЫ» УСТУПІЛІ ПАМІЖ САБОЮ У СМЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА НА БУДАЎНІЦТВА СІЛАСНЫХ ВЕЖАЎ І ЯМ.

У ВЫКАНАНЬНЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ДАГАВОРУ КАЛГАСЬНІКІ АРЦЕЛІ «РАСЬСЬВЕТ—ПЕРАМОЖЦА» ПАБУДАВАЛІ СІЛАСНУЮ ВЕЖУ НА 300 ТОН СІЛАСНАЙ МАСЫ І АДНУ ПАЎВЕЖУ НА 100 ТОН. У КАЛГАСЕ ТАКСАМА КАНЧАЕЦЦА ПАБУДОВА НОВАЙ ПАЎВЕЖЫ НА 200 ТОН СІЛАСУ І АДНА СІЛАСНАЯ ЯМА НА 100 ТОН. КАЛГАС «ПРАМЕНЬ КАМУНЫ» З СВАЙГО БОКУ ПАБУДАВАЎ УЖО 6 СІЛАСНЫХ ЯМ, У ЯКІХ МОЖНА ЗАСІЛАСАВАЦЬ ЗВЫШ 300 ТОН ЗЯЛЕНАЙ МАСЫ. КАЛГАС ПРЫСТУПІЎ ДА БУДАЎНІЦТВА СІЛАСНАЙ ВЕЖЫ НА 300 ТОН СІЛАСУ. УСЛЕД ЗА ГЭТЫМ ГОДЗЕ АРЦЕЛЬ «ПРАМЕНЬ КАМУНЫ» БУДЗЕ МЕЦЬ ЗВЫШ 600 ТОН ЗЯЛЕНАЙ СІЛАСНАЙ МАСЫ.

### Месячнік бязьдзейнасьці

ВІЦЕБСК. (Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ»). Месячнік сіласаваньня кармоў у ВІЦЕБСКАЙ акрузе ПРАВАЛІЎСЯ. Прарыў на сіласным фронце не ліквідаваны. Месячнік ня даў ніякага перапому ў будаўніцтве сіласных вежаў і ям.

Камсамольская арганізацыя Віцебшчыны не дабілася ніякіх канкрэтных дасягненьняў у справе сіласаваньня. У раёнах сіласнае будаўніцтва фактычна сарвана. Напрыклад, у ГАРАДОЦКІМ раёне калгасы за адзінкавымі выключэньнямі яшчэ зусім ня прыступілі да будаўніцтва сіласных вежаў і ям. Гарадоцкі раённы выканком палажыў пляны сіласаваньня кармоў пад сукно. Між тым, практыка асобных калгасаў выразна паказвае, што пры адпаведнай арганізацыі працы можна ня толькі выканаць, але і перавыканаць заданьні па будаўніцтве сіласных вежаў і ям. Напрыклад, камуна імя ЛЕНІНА і калгас імя СТАЛІНА з посьпехам будуюць сіласныя ямы. Прыклад лепшых калгасаў зусім не пераносіцца ў іншыя калгасы і камуны.

У СІРОЦІНСКІМ раёне мясцовыя арганізацыі аднесьліся да месячніка з выключным бюракратызмам. Толькі 15-га ліпеня ў раёне афіцыйна пачаўся месячнік. І як пачаўся. Пагаварылі, надавалі шмат прыгожых абяцаньняў, але далей споў не пайшлі. Калгасы ў Сірсцінскім раёне не прыступілі да сіласнага будаўніцтва. Зусім убаку стаіць раённая камсамольская арганізацыя. Раённыя курсы па сіласаваньні кармоў укамплектаваны толькі на 50 проц. Такое становішча характэрна і для іншых раёнаў. Энэргічныя меры па ліквідацыі гэтых прарываў да сёньняшняга дня нікім ня ўжываюцца. І акруговыя і раённыя арганізацыі топчацца на адным месцы, не рэагуючы на фактычны правал сіласаваньня кармоў у акрузе.

### 0,5 проц. пляну...

МАЗЫР. (Брыгада «Зьвязды»). МАЗЫРСКІ акраз, як мы паведамлялі раней, скараціў заданьне ННЗ БССР па сіласаваньні кармоў на... 50 проц. Але і гэта скарочанае заданьне правальваецца. Раёны не праводзяць ніякіх практычных мерапрыемстваў па сіласаваньні кармоў і будаўніцтве сіласных вежаў і ям.

Ва многіх раёнах Мазыршчыны да сёньняшняга дня няма ні адзінай сіласнай ямы. У акрузе лічаць, што ПЕТРЫКОЎСКІ раён ідзе наперадзе па сіласным будаўніцтве. Між тым, у гэтым раёне плян сіласаваньня кармоў выкананы толькі на 0,5 проц. Раённыя курсы па сіласаваньні кармоў сарваны. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі, а таксама калгасна-каапэрацыйныя і зямельныя органы Пятрыкоўскага раёну нічога ня робяць па сіласаваньні.

## Пераможнае наступленьне Кітайскай Чырвонай Арміі

### Пад Чырвонымі сьцягамі ўвайшлі ў Чанша

#### ІМПЭРЫЯЛІСТЫЯ РАСПАЎСЮДЖВАЮЦЬ ВЫДУМАНЫЯ ЧУТКІ

ШАНХАЙ, 31. Непасрэдных паведамленьняў з Чаньша пакуль што няма. Большасьць паведамленьняў, якія паступаюць з Ханькоу ад тэлеграфных агэнцтваў Рэйтэр і Сімбун-Рэнга, яўна тэндэнцыёзны і непраўдападобны.

Аднак, нават на падставе гэтых вестак крыху высьвятляецца агульнае становішча. Змаганьне за Чаньша пачалося 26-га ліпеня, калі пераапранутыя у цывільнае чырвоныя армейцы і камуністы у вялікім ліку ўвайшлі ў горад. 27-га ліпеня чырвоныя войскі, якія падышлі да брам гораду, зараз-жа ўступілі ў Чаньша. Паніка, ахапіўшая горад, яшчэ больш узмацнілася ў сувязі з паўстаньнем часьцей мясцовага гарнізону, перайшоўшых на бок чырвоных. Губэрнатар Чаньша, выдатныя «шоўнікі і большасьць ураднага войск упяклі яшчэ 26-га ліпеня. Войскі, якія прабавалі абараняць горад, панесьлі вялікія страты. Часьці Чырвонай арміі ўвайшлі ў Чаньша з чырвонымі сьцягамі, з чырвонымі істужкамі і кветкамі ў пяцілоках. Паводле паведамленьняў паказаных тэлеграфных агэнцтваў, горад быў зараз-жа ўпрыгожан чырвонымі сьцягамі, зьявіліся камуністычныя лістоўкі з лёзунгамі.

Імпэрыялістычны друк у Кітаі асабліва старанна распаўсюджвае самыя выдуманыя чуткі аб дзейнасьці часьцей Чырвонай арміі, ваюючых Чаньша.

Увесь гэты шум, падняты імпэрыялістычнай прэсай, бязумоўна, мае мэтай падрыхтоўку грамадзкай думкі ў Кітаі і за граніцай да выступленьня морскіх сіл імпэрыялістых, сканцэтраваных на рацэ Цянцзян у Чаньша. З Ханькоу у Чаньша высланы вялікія вайсковыя сілы, бракіраваныя цягнікі, самалёты і ваенныя суды з загадам абыякай цаной заняць Чаньша. Пакуль што яшчэ няма вестак аб сутычцы гэтага дагаварэнага палітычнае становішча ў сувязі з посьпехамі камуністычнага руху ў раёне Янцзыіна і апублікаваў цыркуляр, які, апроч Ван Цьзін-бэя, падпісаў Вен Цін-шан, Фын Юй-сян і інш. генэралы паўночнай групоўкі. Цыркуляр абвінавачвае Чан Кай-шы ў тым, што ён аддаліў войска ад басэйна Янцзызна, будучы заняты змаганьнем за захаваньне сваёй улады і такім чынам камуністыя атрымалі магчымасьць разьвіваць пасьпяховыя ваенныя дзеяньні. Паводле слоў цыркуляра, Чан Кай-шы патурае камуністым у той час, як паўночныя генэралы нібы клапацяцца аб «інтарэсах народу». Цыркуляр заклікае кітайскую нацыю вынаць Чан Кай-шы і задушыць камуністычны рух.

### *Чырвоныя занялі Нанчань*

ПЭЙПІН, 1. Як паведамляе «Даг ун-Бао», чырвоныя войскі занялі 30 ліженя горад Нанчань (правінцыя Цьзянсі).

#### ГЕНЭРАЛЫ ДЗЯРУЦЦА ПАМІЖ САБОЮ

ПЭЙПІН, 1. Нашыраны пленум, скліканы гаміндаўскімі рэарганізацыяністымі, на чале з Ван-Цьзін-веем, учора абмеркаваў палітычнае становішча ў сувязі з посьпехамі камуністычнага руху ў раёне Янцзыіна і апублікаваў цыркуляр, які, апроч Ван Цьзін-бэя, падпісаў Вен Цін-шан, Фын Юй-сян і інш. генэралы паўночнай групоўкі. Цыркуляр абвінавачвае Чан Кай-шы ў тым, што ён аддаліў войска ад басэйна Янцзызна, будучы заняты змаганьнем за захаваньне сваёй улады і такім чынам камуністыя атрымалі магчымасьць разьвіваць пасьпяховыя ваенныя дзеяньні. Паводле слоў цыркуляра, Чан Кай-шы патурае камуністым у той час, як паўночныя генэралы нібы клапацяцца аб «інтарэсах народу». Цыркуляр заклікае кітайскую нацыю вынаць Чан Кай-шы і задушыць камуністычны рух.

## АДУСЮЛЬ

### Французкая дэпегацыя выяжджае на кангрэс Прафінтэрну

Французкія працоўныя масы з вялікім уздымам рыхтуюцца да 5-га кангрэсу (зьезду) Прафінтэрну, які адбудзецца ў Маскве. Даклад аб кангрэсе заслухоўваецца з вялікай зацікаўленасьцю і жвава абмяркоўваецца.

Ужо абрана французкая дэлегацыя на кангрэс у складзе 135 дэлегатаў, 35 дэлегатаў маюць рашаючы голас, астатнія 100—дарадчы. 18 дэлегатаў абраны на агульных сходах рабочых буйнейшых заводаў і фабрык Францыі. Астатнія 122 дэлегаты абраны на раённых і акруговых канфэрэнцыях, скліканых рэвалюцыйнымі саюзамі.

Сярод дэлегатаў ёсьць таксама работніцы, моладзь, беспрацоўныя батракі і

### Крывавыя сутычкі ў вёсках Дабруджы

Румынскі ўрад узмоцнена праводзіць усяленьне ў Дабруджу (назва вобласьці) румынскіх кулакоў і бальшых жандараў. Кулакі і жандары атрымліваюць зямлю, аднятую ў турэцкіх і балгарскіх сялян паводле закону, выданага ў 1912 годзе. Паводле гэтага закону, многія дабруджане пазбаўляліся права ўласьнасьці на зямлю над відам таго, што гэтая зямля пры турэцкім панаваньні была ўласнасьцю султана.

Паміж усяляемымі капёністымі і мясцовымі сялянамі ня спыняюцца крывавыя сутычкі. Нядаўна такая сутычка адбылася ў вёсцы Сучак. Балгарскія і турэцкія сяляне аказалі румынам, якія хацелі адняць у іх лепшыя вучасткі, жорсткае супраціўленьне. Завязаўся сапраўдны бой, які спыніўся пасьля прыходу войска і жандараў. З абодвых бакоў ёсьць параненыя. Улада адразу ўзялася шукаць вінаватых. У першую чаргу яны шукаюць іх сярод абараняўшых свае правы балгарскіх і турэцкіх

## Усе сілы—на пасьпяховае правядзеньне хлебазагатовак

### МАБІЛІЗУЕМ КАЛГАСНУЮ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКУЮ ГРАМАДЗКАСЬЦЬ НА ЗМАГАНЬНЕ З КУЛАКОМ

### На ўдарныя тэмпы

Пляны хлебазагатовак Белкаапсаюзам былі распрацаваны і накіраваны на месцы 22 ліпеня. Гэтыя пляны ў 5-ці дзенны тэрмін павінны былі быць разьвёрстаны па асобных раёнах. Па вестках, якія ёсьць у Белкаапсаюзе на сёньняшні дзень, пляны разгледжаны і зацьверджаны толькі ў 3 акругах—Магілеўскай, Бабруйскай і Аршанскай. Такім чынам пляны пакуль што толькі разглядваюцца і зацьверджаюцца акруговымі выканкомамі. Калі тэмпы разгляду пляну ня будуць узмоцнены, мы стаім перад небясьпекай, што да нізоўкі яны дойдуць пасьля хлебазагатовак.

Сёлета спажывецкая каапэрацыя будзе адчуваць вялікі недахват у кадрах спэцыялістых—прыёмшчыкаў. Перад каапэрацыйнай сыстэмай стаіць задача неадкладна, поўнасьцю забясьпечыць усе прыёмачныя пункты патрэбнымі работнікамі.

Вельмі слаба забясьпечаны прыёмачныя пункты спажывецкай каапэрацыі патрэбнай тарай і вагай. Каапэрацыйны актыў і работнікі нізоўкі да гэтага часу вельмі мала ўвагі зварачаюць на пытаньне мабілізацыі тары і вагі. Слаба таксама абстаіць справа з забясьпячэньнем патрэбнымі складамі. Будаўніцтва новых складаў па лініі спажывецкай каапэрацыі праходзіць вельмі павольна, і няма цьвёрдай упэўненасьці, што да пачатку загатовак праграма будаўніцтва складаў будзе поўнасьцю выканана.

Работнікі нізоўкі павінны выявіць, дзе толькі магчыма, усе склады якія могуць быць скарыстаны для захаваньня ніцка-серадняцкіх масы вёскі, сходы беднаты павінны быць мабілізаваны для разгортваньня плянаў на сельсавету, для адшуканьня патрэбных складаў, тары і вагі.

Вялікая работа павінна быць праведзена сыстэмай спажывецкай каапэрацыі па лініі арганізацыі чырвоных абозаў, па лініі арганізацыі бесьперабойнага прыёму збожжа ад сялянства і калгасу. Прыёмачныя пункты павінны так наладзіць работу, каб сяляне не стаялі ў чарзе па некалькі гадзін і трацілі час пры здачы збожжа.

Трэба шырока правесьці растлумачальную кампанію аб парадку прэміяваньня здатчыкаў хлеба прамтаварамі. Тут перад работнікамі спажывецкай каапэрацыі стаіць задача, як мага больш эканомна і правільна разьмеркаваць фонды на прэм'яваньні здатчыкаў збожжа. Для гэтай работы трэба мабілізаваць увесь каапэрацыйны актыў, крамныя камісіі і г. д. Паміж асобнымі прыёмнымі пунктамі, складамі, раёнамі трэба шырока ўжываць мэтад сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва на лепшую і хутчэйшую прыёмку хлеба.

На месцох зараз павінна быць праведзена вялікая работа па праверцы дагавораў па кантрактацыі. Трэба выявіць колькі кожная гаспадарка павінна здаць збожжа па кантрактацыі, забясьпечыўшы 100 проц. выкананьне дагавораў па кантрактацыі. Сыстэма спажывецкай каапэрацыі павінна так пабудаваць сваю работу, каб збор гэтага году стымуляваў кантрактацыю ў будучым збожжа.

### НІЯКІХ ПЕРАКІДАК РАБОТНІКАЎ САЮЗХЛЕБУ

Пытаньне забясьпячэньня ссыпных пунктаў патрэбнымі кадрамі прыёмшчыкаў абстаіць далёка нездавальняюча. Толькі пры Саюзхлебе былі арганіз

*ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА*

# Бальшавіцкая самакрытыка---вярнейшая зброя ў барацьбе за лінію партыі

## БЯЗЬЛІТАСНА ЗМАГАЦЦА З УСЯЛЯКІМ ЗАЦІСКАМ І СКАЖЭНЬНЕМ САМАКРЫТЫКІ

## За дзейную, бальшавіцкую самакрытыку

У сваіх пастановах XVI зьезд партыі яшчэ раз падкрэсьліў неабходнасьць далейшага разгортваньня самакрытыкі. Зьезд падагуліў першыя баявыя зводкі барацьбы партыі за самакрытыку. «Наша самакрытыка і наша ўнутрыпартыйная дэмакратыя аказаліся магутным арганізацыйным вагаром, які ўзмацніў партыю і даў магчымасьць разьбіць правых апартуністых на гапаову» (з дакладу тав. Кагановіча). Партыя руйнуе ўсялякія спробы з боку апартуністых прыкрыцца самакрытыкай для атакі на лінію партыі і яе кіраўніцтва.

Бальшавіцкая самакрытыка — вярнейшая зброя ў барацьбе за генэральную лінію партыі. Той, хто зацісканае самакрытыку, хто перашкаджае разгортваньню творчай ініцыятывы мас, той хто тармозіць барацьбу з перагібамі і недахопамі, той вольна ці нявольна іграе на руку клясаваму ворагу.

Таму XVI зьезд партыі яшчэ раз мабілізаваў увагу партыі на неабходнасьць весьці барацьбу з усялякім зацісканем і скажэньнем самакрытыкі, «шырока разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку для ўзьняцьця ідэёвага ўзроўню бальшавіцкага выхаваньня партыйных кадраў, партыйных мас, для выкрыцьця скажэньняў партыйнае лініі, апартунізму на практыцы і для далейшага разьвіцьця ўнутры-партыйнай дэмакратыі» (з рэзалюцыі XVI партзьезду).

Матар'ялы, якія мы зьмяшчаем у сённешнім нумары, пацьвярджаюць тое, як гэта адначыў партзьезд, што «самакрытыка, як штодзённы арганічны мэтад партработы, не ва ўсіх арганізацыях дастаткова разгорнута».

Тое, што рабілася ў ЧАЧЭРСКІМ раёне (Гомельшчына), зьяўляецца яскравым прыкладам грубага заціску самакрытыкі, глушэньня рабочай ініцыятывы.

Ня дзіўна, што на гэтым фоне сталі магчымымі і расквітелі тыл сапраўды крымінальныя справы, якія рабіліся з боку некаторых раённых працаўнікоў. У ЧАЧЭРСКІМ раёне цкаваліся рабкоры, рабіліся брудныя справы, якія замазваліся раённым кіраўніцтвам. Цікава, што усё гэта рабілася ўжо пасьля арганізацыйных вывадаў Гомельскай АКК. Чачэрскі райком ня здолеў разгарнуць самакрытыку, наадварот, ён трымаў яе ў ціскох, ён груба яе зацісканў.

Зьяўляецца характэрным мэтад заціску самакрытыкі, які ўжываецца Ногінавым, сакратаром райкому, — ён проста называе тых, што адважваюцца крытыкаваць яго, «трацкістымі». Ён паўтарае выпрабаваны мэтад зажымшчыкаў і апартуністых.

Гэты выпадак павінен быць вурокам для ўсіх арганізацый.

Друк зьяўляецца магутнай зброяй партыі ў барацьбе за самакрытыку. Наш друк павінен упарта весьці барацьбу з усялякім зацісканем самакрытыкі, за яе разгортваньне, штодзённа мабілізаваць рабочых і працоўных на барацьбу з усялякімі скажэньнямі яе.

У некаторых асобных арганізацыях і камуністых наглядаецца чыноўніцкая бязьвольная падрыву аўтарытэту. Інакш нельга назваць паводзін бюро парткалектыву «Дзьвіны» ў справе напёту рабкораў, калі бюро замест рэагаваньня на агіднасьці, выкрытыя рабкорам, фактычна садзейнічала цкаваньню іх з боку дырэктара фабрыкі.

Партыйныя арганізацыі павінны змагацца за сапраўдную дзейную самакрытыку. Тое, што робіцца ў МАЗЫРЫ, калі таварышы, якія скампрамэтавалі сябе на адказнай рабоце, якія скажалі лінію партыі — вылучаліся зноў на адказную і нават на больш адказную работу, — зьяўляецца скажэньнем самакрытыкі, скажэньнем дырэктыў партыі.

Узброеная баявымі дырэктывамі XVI партзьезду партыя будзе змагацца за далейшае разгортваньне самакрытыкі, за далейшае завастрэньне гэтай магутнейшай зброі барацьбы за лінію партыі. Партыя будзе змагацца за тое, каб яшчэ больш ператварыць самакрытыку ў [illegible] дзейную зброю барацьбы за сацыялізм.

## Чатыры факты

У Мазыры атрымалася так, што калі хтосьці не спраўляецца з даручанай яму працай, або скрыўляе лінію партыі, той вылучаецца на больш адказную работу. Некалькі фактаў.

Пад кіраўніцтвам былога сакратара акругкому камсамолу Ракуба мазырская камсамольская арганізацыя зрабіла полы рад грубейшых памылак. Мазырскі акругком камсамолу даў дырэктыву «закончыць суцэльную калектывізацыю акругі да вясны гэтага году». Акругком камсамолу даў цэлы рад іншых галавацянскіх дырэктыў. А вынікам гэтага зьявілася тое, як адзначыў нечарговы пленум Мазырскага акругкому камсамолу, што «камсамольская арганізацыя стала перад пагрозай спаўзаньня на чужыя клясавыя рэйкі».

А пасьля ўсяго гэтага—**Ракуба** вылучан інструктарам акругкому КП(б)Б.

Другі факт. **Пушчын** быў сакратаром Калінкавіцкай камсамольскай арганізацыі. Ён адмовіўся паехаць у вёску для работы па калектывізацыі. Яго зьнялі з работы і ён атрымаў суровую вымову... Але ён вылучаецца інструктарам Мазырскага акралгасаюзу.

Трэці факт. Старшыня Калінкавіцкага райвыканкому **Кабановіч** зьнят з работы за заціск самакрытыкі, за прасьледваньне і цкаваньне рабкораў **Сяргейчыка** і **Лявонава.** А пасьля гэтага яго вылучаюць намесьнікам загадчыка Мазырскага акругоага земаддзелу.

Чацьверты факт. **Шчукін,** былы сакратар Калінкавіцкага райкому партыі, быў зьняты з працы за тыя-ж справы, што і Кабановіч. Гэты-ж Шчукін выступаў на райпартсходзе і абараняў галавацяпства і перагібы, якія былі зроблены ім у правядзеньні калектывізацыі. А пасьля ўсяго гэтага яго насылаюць на вучобу ў Сьвярдлоўскі Камвуз.

Можна падаць яшчэ цэлы рад такіх фактаў.

Ш.

## Там дзе душаць самакрытыку

24-га ліпеня ў **Чачэрску** (Гомельская акрута) адбылася раённая нарада рабселькораў, скліканая па ініцыятыве **брыгады «Зьвязды».**

На нараду дня стаялі пытаньні ўборачнай кампаніі, аб працы рабселькораў. У разгорнутых спрэчках выявіўся малюнак адсутнасьці кіраўніцтва з боку райкому КП(б)Б, РК саюзу уборачнай кампаніяй, выявіліся факты **прасьледваньня і цкаваньня рабселькораў,** якія выкрывалі злачынствы з боку работнікаў РК КП(б)Б, РВК і інш.

Толькі два месяцы таму назад Гомельская АКК за заціск і глушэньне самакрытыкі зьняла з работы цэлы рад раённых работнікаў (старшыню РВК, нач. міліцыі, заг. нарасьветы) і многім работнікам дала суровыя вымовы з папярэджаньнем (сакратару райкому Ногінаву, заг. райза Вараб'ёву і інш.), але да гэтага часу факты прасьледваньня і цкаваньня рабселькораў ня спыняюцца. Трэба сказаць, што «Полесская Правда» абмяжоўвалася тым, што пасылала рабселькораўскія допісы цэлымі пачкамі на прасьледваньне.

### „Ад прыёму ўстрымацца"

Актыўны рабкор, 25-тысячнік, Хайкін, які працуе ў калгасе **«Адзінства»** падаў заяву аб прыёме ў партыю, рэкамандавалі яго: сакратар ячэйкі калгасу і сакратар РК КП(б)Б Ногінаў. На РК Хайкіна прынялі кандыдатам у члены КП(б)Б. Праз некалькі дзён т. Хайкін выкрыў, што старшыня калгасу Марон возіць на дом малочныя прадукты сакратару райкому Ногінаву, культпропу Паўленкову і іншым раённым работнікам. Пытаньне было пастаўлена на пасяджэньні праўленьня калгасу. На заўтра Хайкіна вызваў да сябе Ногінаў, «накруціў хвост», потым сказаў: «Я атрымліваў малако і масла і буду атрымліваць». Праз некалькі дзён Ногінаў забраў назад сваю рэкамэндацыю, а райком па ініцыятыве Ногінава пастанавіў пераглядаець пастанову аб прыёме Хайкіна ў кандыдаты і «ад прыёму ўстрымацца». Сыцам як ня выяўленага. Хайкіна цкавалі, як лодара і бузацёра.

### „Прызнайся—гэта ты пісаў"

Актыўны рабкор Безбародкін (трактарыст) напісаў некалькі заметак аб непарадках у калгасе. Як водзіцца «Полесская Правда» паслала «на прасьледваньне». Прасьледваньне даручылі таму, на кого была напісана заметка — сакратару ячэйкі.

Некалькі раз Безбародкіна выклікаў да сябе намесьнік сакратара райкому Ламака і лаяў яго за допісы па старшыню калгасу Марона. Безбародкіна таксама назвалі лодарам і бузацёрам. Цяпер, калі прыбывае ў ячэйку калгасу допіс на прасьледваньне, дык сакратар ячэйкі выклікае Безбародкіна і пры усіх крычыць: «Прызнайся, гэта ты пісаў такую бязглуздзіцу?»

Факты пасылкі рабкораўскіх допісаў на праверку тым, на каго яны напісаны пацьвярджаюцца самімі сакратарамі ячэек («Навухавічы», «Адзінства» і г. д.).

### Каб не падымаць „громкую справу"

У інтэрнацыяналізаваным калгасе «Пралетарый» выявіліся факты антысэміцкіх контр-рэвалюцыйных вылазак, цкаваньня яўрэяў-калгасьнікаў і калгасьніц. Каровам давалі імя яўрэек калгасьніц: Сура, Броха, Хайка і г. д. Коням імя яўрэеў-калгасьнікаў: Лысы Янкель, Іцка, і г. д. На вечар у дзень 8 сакавіка паравалі 8 бікетаў для таго, каб ня даць іх яўрэйкам калгасьніцам, арудаваў інструктар калгасу Давідовіч. Рабселькоры сваячасова сыгналізавала у **«Полесскую Правду», апошняя гэтых фактаў не надрукавала,** а паслала на прасьледваньне, а райком, хаця факты цалкам пацьвердзіліся, **замазаў іх,** баючыся падымаць «громкую справу».

Першага начальніка міліцыі зьнялі з працы за глушэньне самакрытыкі. Яго намесьнік ідзе па тым-жа шляху. Быў напісаны допіс у «Полесскую Правду» (зноў «на прасьледваньне») аб тым, што нач. Чачэрскай міліцыі даў грошы і коні міліцыянэрам на паездку ў вёскі, каб закупіць сабе кароў на мяса. Каровы закуплены, зарэзаны і падзелены паміж імі. Факты пацьвердзіліся — начальніку міліцыі Шарсьцюку паставілі на від. Тады ўстае Шарсьцюк і заяўляе: «Хаця аднаго ўжо зьнялі, але я таксама ведаю, хто гэта на мяне пісаў». Нават ніякай заўвагі ад райкому Шарсьцюку не атрымаў.

### Пастаянна губляюцца

Допісы, якія прысылаюцца на прасьледваньне ў РСІ, залежваюцца, а вельмі часта губляюцца. Гэтымі днямі член РСІ Кардашэнка паехаў у месячны водпуск і забраў з сабой усе допісы, прысланыя на прасьледваньне. Пастанова Чачэрскай РСІ ад 30-III-1930 г. за № 7 аб зьняцьці з работы аднаго злачынцы да гэтага часу ня выконваецца.

Органам НК РСІ трэба прыняць рашучыя захады для спыненьня цкаваньня і прасьледваньня рабселькораў. «Полесская Правда» павінна больш уважліва, больш чула абслугоўваць рабселькорыю Гомельшчыны.

(Усе паказаныя факты мелі месца пасьля арганізацыйных вывадаў Гом. АКК).

### „Каб яны самі ўцяклі"

Нарада вылучэнцаў, якая адбылася гэтымі днямі, пацьвердзіла ўсе вышэй паказаныя факты, канстатавала засьмечанасьць апарату савецкіх і каапэрацыйных установаў, прасьледваньне і цкаваньне вылучэнцаў. Бюракраты і зажымшчыкі самакрытыкі стараюць такія абставіны для вылучэнцаў, «каб яны самі ўцяклі». Сакратар РК КП(б)Б Ногінаў кляйміць тых, якія выступаюць з крытыкай, трацкістымі. Выступленьне рабочага папяровай фабрыкі «Гэрой Працы» т. Курылёва аб неабходнасьці паўторнай чысткі апарату Чачэрскага спажывецкага т-ва, Ногінаў заклююміў на нарадзе вылучэнцаў як «трацкісцкую вылазку». А факты паказваюць, што Курылік меў поўную рацыю. Вось некаторыя факты.

Рабочага лесазаводу Басава вылучылі на працу ў каапэрацыі. Дэўгі час (тры месяцы) праўленьне спажывецкага т-ва зусім не дапушчала да работы, пакуль аб гэтым не напісалі ў «Полесской Правде». Пасьля гэтага Басава пазначылі прыказчыкам у краму. Але гэта адбылося для адводу вачэй, а сапраўды Басава трымалі на набягушках, даваралі толькі дзёгаць, а ў краму ня пускалі. Заг. крамай Галуб'еў усякім чынам цкаваў Басава, гаворачы: «Які з цябе прадавец», а каб стварыць умовы, «каб ён сам уцёк», яму вызначылі пэнсію ў 40 руб. замест атрымліваемых на заводзе 60 рублёў.

Вылучэнку работніцу запалкавай фабрыкі т. Кардзін, якая працуе членам праўленьня, увесь час цкуюць. Нам. старшыні праўленьня спажывецкага т-ва Матусаў крычыць: «Такіх, як ты нам непатрэбна».

Райком зусім на цікавўся працай вылучэнцаў, не дапамагаў ім.

Аб засьмечанасьці апарату спажывецкага т-ва сьведчыць таксама хваля расстрат амаль па ўсіх крамах Чачэрскага раёну. Усе гэтыя факты праходзяць міма райкому партыі.

У сваім выступленьні сакратар РК тав. Ногінаў імкнуўся замазаць вострыя моманты выступленьня вылучэнцаў.

**Брыгадзір «Зьвязды»**
**ФАРБЭРАЎ.**

Ударная пабудова 76 кватэрнага дому на Маскоўскай вуліцы. Будаўнікі спаборнічаюць з пабудовай Дзяржбібліятэкі. Каменная укладка выканана на 2 месяцы раней тэрміну

## Сударагі паралітыка

Капіталізм ляжыць у ложку і кортчыцца ў сударагах сусьветнага эканамічнага крызісу. Бабуля гісторыя, ня мічнага крызісу. Бабуля гісторыя, ня ведаючы адпачынку, усе тужэй закручвае вярбоўку па шыі капіталізму. Яна ўжо вычарпала ўсе магчымыя запасы сіл, якія маглі падтрымліваць капіталістычны арганізм. Усё бліжэй дзень, калі гэты арганізм распластаецца ў прагрэсыўным паралюшы.

Часамі паралітыку здаецца, што ён зноў атрымаў сілу маладосьці і можа ісьці наперад. Гэтую ілюзію падтрымліваюць у хворага буржуазныя журналісты, прафэсары, сацыял-дэмакраты—усе шматлікія дактары, прыстаўленыя да безнадзейна хворага. У іх абавязак даказваць давесьці масам тое, што арганізм капіталізму яшчэ мае жыцьцёвыя сілы, варта толькі паберагчы іх. А адсюль рэцэпт:

Проспэрыці—квітненьне...
Мір у прамысловасьці...

Рабочыя павінны ісьці на ахвяру для «агульных» інтарэсаў «айчыны». Вось адпошнае слова сацыял-дэмакратычных дактароў капіталізму. Гэтым занята спэцыяльная лябараторыя пад шыльдаю: «II Інтэрнацыянал». Разам з «пілюлямі адроўя» для капіталізму ту-жа выробляюцца і атруты, прызначаныя для барацьбы з пашыраная хваробай, вядомай пад назваю «эпідэмія сымпатыі да СССР».

Жоўтыя дактары працуюць дні і ночы, вышукваючы самыя найпоўныя спосабы, каб падлячыць цынізізаванага хворага і атруціць антысавецкай атрутай больш галоў мас. Гэтаю справаю займаюцца такія праслаўленыя майстры, як Каўцкі ў Вене, Поль Банкур у Парыжы, Грын—у Вашынгтоне, Мюллер—у Бэрліне і Макданальд— у Лёндане.

І ўсё-ж кожны новы дзень прыносіць усё больш бязрадасныя весткі аб стане іх пацыента—капіталізму. Сымптомы эканамічнага крызісу становяцца ўсё больш вострымі, абцугі яго ўсё тужэй сьціскаюць арганізм капіталізму, і мы чуем, як пад гэтым цяжарам трашчыць і ломіцца станавы хрыбет капіталістычнага сьвету.

Аб гэтым нядаўна гаварыў на XVI зьезьдзе УсеКП(б) т. Сталін, які выступаў ва ўсеўзбраеньні фактаў, ліпбаў і выкладак. Увесь буржуазны сьвет жыве пад знакам страшнага эканамічнага крызісу. Амэрыка, вось тая Амэрыка, якая яшчэ ня так даўно зьяўлялася ўзорам для Эўропы, «дабрабыту» якой жадалі для сваіх краін гэроі з II Інтэрнацыяналу—гэтая Амэрыка сустрэла 1930 год жорсткім крахам біржы і рэвольвэрнымі стрэламі збанкрутаваўшых біржавікоў. Нават праслаўлены дыктатар Гувэр бясьсільны што-небудзь зрабіць, каб зьмякчыць крызіс. Самае разумнае, што мог прыдумаць Гувэр гэта заклікаць фэрмэраў скараціць пасеўна 25 проц. і спаліць на вогнішчы тысячы аўтамабіляў і сотні тысяч цэнтнэраў пшаніцы. Але 8 мільёнаў беспрацоўных, як здань, стаяць каля парогу амэрыканскага дому, напамінаючы яго ўладаром аб блізкім наступленьні расплаты па гістарычным рахунку.

За Амэрыкай—Англія, клясычная краіна разьбітага хваробамі старасьці капіталізму,—яна яшчэ больш востра перажывае ліхаманку крызісу. Быў час, калі Англію не называлі інакш, як «добрай і вясёлай Англіяй». Гэты час—далёка незваротнае мінулае. Цяпер аб Англіі гавораць інакш. Яна даўно ўжо страціла сваю ролю сусьветнага гандляра, уступіўшы свае месца Амэрыцы і Нямеччыне. Даўно ўжо мінулі тыя часы, калі калёніі Англіі, падобна біблейскім авечкам дазваляялі ёй спакойна дуліць з сябе скуру. Цяпер там ведьмі многа клопатаў. І Англія вымушана замест тавараў ваяць у калёніі кулаты, танкі і самалёты.

У той-жа час у сябе дома пэрспэктывы Англіі сумныя: эканамістыя прадказваюць, што хутка налавіна насельніцтва застанецца бяз работы.

Ляманш не зьяўляецца мяжой крызісу. На кантынэнце—у Нямеччыне, Францыі, у Польшчы такі-ж самы малюнак позьняй восені капіталізму. Толькі ёсьць адна галіна дзе пагражаюць бяскрызіснае ажыўленьне і нарост: гэта—ваенная прамысловасьць. Капіталізм арганізуе, робячы адчайныя спробы адцягнуць час сваёй гібелі. Вайна, яшчэ больш жорсткая і руйнуючая чым вайна мінулая,—вось той апошні сродак, пры дапамозе якога старэючы капіталізм зьбіраецца прадоўжыць сваё існаваньне. Вайна перш за ўсё супраць таго краю, дзе над капіталізмам пасьпяваюць магільны курган. Вайна супраць таго краю, які «на ўсіх парах ідзе ў шляху да сацыялізму».

У гэтым краі, дзе 13 год кіруе рабочая кляса, не памяншаецца, а павялічваецца плошча пасеву; тут не закрываюцца, а адкрываюцца дзесяткі новых фабрык і заводаў-гігантаў, уварваўшыя ў сябе ўсе дасягненьні капіталістычнай тэхнікі. Тут ня выкідваюцца на вуліцы шпарка ўзрастаюць і пашыраюцца рады рабочае клясы; тут не павялічваецца да 10-12 гадзін працоўны дзень, а зьмяншаецца да 7 гадзін.

У гэтым адзіным на зямной куле краі няма крызіснага суму, а ёсьць шырокі дзёраз і ўпэўненая праца тысяч і мілёнаў ударнікаў—байцоў за пяцігодку. І чатыры гады. У гэтым краі ведаюць пра цяжкасьці. Але розьніца паміж гэтымі цяжкасьцямі і цяжкасьцямі капіталізму такая, як паміж маладосьцю і старасьцю. Нашы цяжкасьці выклікаюцца нашым шпаркім ростам, а там—шпаркім заняпадам.

Вось чаму трэці год пяцігодкі мы стракаем ня з меншай упэўненасьцю перамозе. Нават людзі, якія це хварэюць ліпкам сымпатыя да СССР—(англійскі лейбарыстыя)—былі вымушаны прызнаць «Слаўныя годы сацыялізму СССР». А яшчэ раней, адзін з разумнейшых нашых ворагаў, Лёйд-Джорж заявіў, што «пяцігодка ня толькі рэальна, але і разумна». Гэта—лішняе пацьверджаньне аб перавагах сацыялістычнага ладу над капіталістычнай сыстэмай. І кожным днём гэта становіцца ўсё больш ясной для тых рабочых, якія яшчэ сёньня знаходзяцца пад сьцягам II Інтэрнацыяналу.

Міжнародны Чырвоны Дзень—1-е жніўня зьяўляецца днём баявой перакліч рабочых усіх капіталістычных краін, незалежна ад іх партыйнасьці. Ці сілах Каўцкія, Банкуры і Цэргібелі зрыць вочы сваім рабочым на посьпехі ў СССР, ці могуць яны затрымаць ход пралетарскіх калён на вуліцы 1-го жніўня пад лёзунгам абароны СССР? Яны паспрабуюць супрацьставіць баявому дню 1-га жніўня свой дзень 4-го жніўня—дзень сьмерці II Інтэрнацыяналу, паспрабуюць яшчэ раз адвесьці масы ў бок ад надыходзячых вялікіх клясавых баёў.

Ці ўдасца ім гэта? Не, бо навярнуцца кола гісторыі ніхто не патрашчыць. Пакуль што яны змогуць пахапаць на вуліцы супроць пралетарскіх калён ударнікаў і танкі. Але-ж гэты сродак ужо не дае патрэбных вынікаў: кожная крававая баня вырывае з-пад уплыву буржуазыя-фашызму ўсё новыя тысячы рабочых.

Другі Міжнародны Чырвоны Дзень 1-га жніўня—другая веха, якую ставіць сусьветны пралетарыят на сваім шляху барацьбы за СССР, за сусьветны Кастрычнік.

Ён выканае сваю гістарычную місію магільшчыка капіталізму.

Р. К.

*В. Міцкевіч-Капсукас*

## Эканамічны крызіс, Польшча і лімітрофы

У момант часовага кан'юнктурнага паляпшэньня становішча ў гаспадарцы Польшчы, пасьля фашысцкага перавароту, з лёгкай рукі т. Бранда была створана тэорыя, згодна якой маладыя дзяржавы маюць значныя перавагі перад старымі (як Нямеччына, Англія) тым, што яны нібы-та маюць магчымасьць значна больш пасьпяхова разьвівацца за кошт разьвіцьця сродкаў вытворства, пабудовы новых чыгунак, новых галін прамысловасьці і інш. Сапраўднасьць поўнасьцю абвергла гэту тэорыю. На глебе надзвычайнага абяднаньня працоўных мас і звужэньня ўнутранога рынку яшчэ ў канцы 1928 году Польшча ўступіла ў паласу эканамічнага крызісу, які асабліва моцна абвастрыўся ў канцы 1929 г., дзякуючы пачаўшамуся сусьветнаму эканамічнаму крызісу і асабліва, сусьветнаму аграрнаму крызісу.

Асабліва востры крызіс перажывае зараз у Польшчы **сельская гаспадарка.** Ён выліканы, перш за ўсё, сусьветным аграрным крызісам, які выяўляўся ў першую чаргу, у рэзкім падзеньні цэн на прадукты сельскае гаспадаркі. Пасьля некаторага ўзьніму цэн на збожжа у канцы сакавіка і пачатку красавіка, які зьявіўся вынікам надзвычайных мер фашысцкага ўраду і патрабаваў значных затрат польскай скарбніцы, ідзе далейшае папіраньне с.-г. крызісу і адбываецца новае падзеньне цэн на прадукты жывёлагадоўлі і на тэхнічныя культуры. Пры гэтым вялікае значэньне мае той факт, што Польшча вывозіць, галоўным чынам, жыта, цэны на якое на сусьветным рынку асабліва панізіліся. Так, у 1927-28 г. цана дацэль-цэнтнэру жыта ў Варшаве дахадзіла да 43,77 злотых, у канцы сакавіка 1930 г. — 20,75 зл., у пачатку мая — 18-19 зл., а ў пачатку чэрвеня — 15,5 зл. У правінцыі цана даходзіць да 10 зл. Прыблізна такое-ж падзеньне цэн на авёс, бульбу. Буржуазныя эканамістыя сьцьверджаюць, што гэтыя цэны ніжэй сабекошту, адсюль шалёная атака памешчыкаў і кулакоў на зарплату с.-г. рабочых. Некалькі павышаныя цэны засталіся толькі на шпаніцу, запасы якой у Польшчы ўжо вычарпаліся. Паводле падлікаў часопісі Дасьледчага Інстытуту гаспадарчай кан'юнктуры і цэн «Гаспадарчая Кан'юнктура», польская сельская гаспадарка з прычыны падзеньня цэн толькі на збожжавых культурах страціла за мінулы гаспадарчы год 400 млн. злотых. Надзеі на пераход ад збожжавае гаспадаркі да жывёлагадоўлі таксама пабляклі, бо для гэтага пераходу патрабуюцца буйныя капіталы, якіх няма; апрача таго на сусьветным рынку пачалося падзеньне цэн і на прадукты жывёлагадоўлі.

Гэта стварае катастрафічнае становішча ў сельскай гаспадарцы Польшчы, пераход ад больш экстэнсыўнае гаспадаркі, да яго дэградацыі. Вось што піша аб становішчы селянскае гаспадаркі Польшчы орган пілсудчыкаў «Бюлетэнь навуковага кааперацыйнага інстытуту»:

Ад пакупцы штучных угнаеньняў да веснавой сяўбы наш селянін ужо зусім і ня думае... Вынікам будзе агульны пераход да экстэнсыўнае гаспадаркі і памяншэньне пасеўнай плошчы пад збожжавымі культурамі. Сяляне памяншаюць прадукцыю збожжавых культур і бульбы да граніц уласнага спажываньня... Далейшы нямінучым вынікам будзе памяншэньне ўжо ў будучым годзе збожжавай прадукцыі краю і заняпад вытворства нашых гаспадарак».

І польскія буржуазныя эканамістыя з лягеру Пілсудзкага загаварылі аб нячуванай і ўсё ўзрастаючай паўпэрыязацыі польскай вёскі, аб тым, што сельская гаспадарка Польшчы ідзе да с.-г. адносін, якія пануюць у Індыі, або Кітаі (Курнатаўскі і інш.).

Паводле даных варшаўскай с.-г. каапэрацыі, у 1929 г. да веснавога сэзону было прадана 14.411 тон штучных угнаеньняў, а ў 1930 г. толькі 5.747 тон. Моцна паменшыўся таксама продаж с.-г. машын.

Ніякіх пэрспэктыў на паляпшэньне ў бліжэйшы час становішча ў сельскай гаспадарцы нават польскія буржуазныя эканамістыя не бачаць. Вялікую прыкрасьць дастаўляе ім факт, што ўраджай хлябоў у гэтым годзе абяцае быць даволі добрым. У сувязі з добрым ураджаем восеньню чакаецца яшчэ большае падзеньне цэн і яшчэ большае абвастрэньне аграрнага крызісу.

«Новы гаспадарчы год, — сказаў у пачатку чэрвеня дырэктар дэпартаманту зямляробства Розэ, — пачынаецца для сельскае гаспадаркі ў выключна цяжкіх умовах. Закрануты ўсе галіны с.-г. вытворства, а таксама ўсе катэгорыі сельскіх гаспадарак».

Розэ ня верыць у магчымасьць пераходу польскае сельскае гаспадаркі ад збожжавае гаспадаркі да жывёлагадоўлі. Адзіную магчымасьць выхаду з крызісу ён бачыць у прадстаўленьні сельскай гаспадарцы (г. зн. памешчыкам і кулаком) доўгатэрміновых крэдытаў і ва ўвядзеньні выязных прэмій на прадукты сельскае гаспадаркі, г. зн. у простым перакладаньні цяжкасьцяй крызісу на плечы шырокіх працоўных мас, з якіх павінны быць выкалачаны гэтыя прэміі. Для гэтага патрабаваліся-б мільёны і мільёны злотых. Невядома, ці ўдасца пры даным становішчы ў Польшчы фашысцкаму ўраду выцісьнуць гэтыя мільёны з надзвычай зьбяднелых працоўных мас. Ва ўсякім выпадку, крызіс сельскае гаспадаркі гэтымі мерамі ня можа быць зьняты.

Востры аграрны крызіс, які выклікаў крайняе звужэньне ўнутранога рынку, і распачаты сусьветны эканамічны крызіс надзвычай абвострылі **крызіс у прамысловасьці.** Зьбяднеьне шырокіх мас і звужэньне ўнутранога рынку прывяло, перш за ўсё, да вострага крызісу ў галінах прамысловасьці, якія працуюць для шырокага спажываньня, г. зн. у лёгкай прамысловасьці — тэкстыльнай, скуранай, драваапрацоўчай і г. д. Занята 30 проц. усіх рабочых апрацоўчай прамысловасьці Польшчы, пэражывае проста катастрафічнае становішча. Яе прадукцыя скарацілася за 13 месяцаў (да лютага 1930 г.) на 41 проц. У лютым і сакавіку ішло далейшае скарачэньне. У красавіку пачаўся некаторы паварот да павялічэньня прадукцыі, аднак, гэта павялічэньне мела толькі часовы, сэзонны характар. Адмова ў абяцаных урадам заказах прывяла ў чэрвені месяцы да новага скарачэньня колькасьці рабочых, якія працуюць у тэкстыльнай прамысловасьці (за 1-7 чэрвеня, паводле афіцыйных даных, лік беспрацоўных ізноў узрос на 4.107). У іншых галінах лёгкай прамысловасьці, паводле даных кан'юнктурнай справаздачы дзяржаўнага «Гаспадарчага банку», становішча не паленшылася і ў красавіку.

Будаўнічы сэзон працякае вельмі слаба, у два разы слабей, чым летась. Ураданыя абяцаньні вялікіх укладаньняў у будаўніцтва аказаліся ня жыцьцёвымі. 50 млн., адпушчаных для будаўніцтва, ня хопіць нават для сканчэньня пачатых пабудоў.

У канцы мінулага году пачаўся крызіс і ў цяжкой прамысловасьці. У выніку накапленьня вялікіх запасаў і скарачэньня заказаў пачала скарачацца здабыча жалезнай руды і вугалю. Да сьнежня месяца ішло павышэньне здабычы вугалю, дзякуючы, галоўным чынам, попыту на замежным рынку. У сьнежні экспарт вугалю скараціўся на 21 проц.; адначасова пачалося моцнае скарачэньне спажываньня вугалю на ўнутраным рынку. Запасы вугалю моцна ўзраслі і пачалося скарачэньне вытворства. З канца 1929 г. па красавік 1930 г. здабыча вугалю скарацілася з 4.100 тыс. тон да 2.600 тыс. тон у месяц, г. зн. на 63 проц. У сакавіку 1930 году здабыча скарацілася ў параўнаньні з сакавіком 1929 г. на 27 проц., у красавіку працягвалася скарачэньне — на 6,5 проц., хаця вываз вугалю за красавік месяц павялічыўся на 41 тыс. тон, г. зн. амаль на 5 проц.

Некалькі лепш становішча ў мэталюргіі, аднак, і там працягваецца падзеньне выплаўкі чыгуну і сталі: за першыя 4 месяцы 1930 г. выплаўка чыгуну паменшылася з 50.707 тон да 37713 тон. у параўнаньні з тымі-ж месяцамі 1929 году — памяншэньне на 24,3 проц.; выплаўка сталі паменшылася са студзеня паменшылася з 50.707 тон да 37.713 тон, у параўнаньні з 1929 г. — на 21 проц.; пракатная прадукцыя скарацілася з 76.402 тон у студзені да 69.084 тон у красавіку. Агульная сума заказаў са студзеня па красавік паменшылася на 28 проц. у параўнаньні з мінулым годам. Параўнаўча невялікае памяншэньне пракатнай прадукцыі тлумачыцца вялікімі заказамі СССР, якія ў першыя два месяцы г. г. паглынулі 95-98 проц. усяго польскага вывазу пракатных вырабаў, а ў сакавіку-красавіку — 78-73 проц.

Майскі нумар «Гаспадарчай кан'юнктуры» піша, што з сакавіка 1930 г. [illegible] скарацілася больш чым на 25 проц. у параўнаньні з сакавіком 1929 г.; пасьля сакавіка ў далейшым працягвалася скарачэньне, хаця і больш павольным тэмпам; у некаторых галінах прамысловасьці прыкмячалася нават некаторае частковае павышэньне прадукцыі. Запасы ў лёгкай прамысловасьці значна паменшыліся; у цяжкай прамысловасьці ёсьць яшчэ большыя запасы. Пры моцным звужэньні ўнутранога рынку і слабой здольнасьці Польшчы канкураваць на зьнешным рынку, нельга чакаць у бліжэйшы час паляпшэньня становішча. Майскі нумар «Гаспадарчай кан'юнктуры» піша, што сумненным зьяўляецца, ці наступіць у працягу бліжэйшых месяцаў паляпшэньне. «Няма яшчэ аднак набліжэньня аздараўленьня і нават больш значнага паляпшэньня». Па сутнасьці, тое самае піша і чэрвеньскі нумар «Гаспадарчай кан'юнктуры».

Адным з асноўных апорных пунктаў адносная стабілізацыі Пілсудзкага было паскарэньне картэляваньня польскай прамысловасьці. Рэзультатам картэляваньня было павышэньне цэн на ўнутраным рынку і гэтым самым яго скарачэньне і заахвочваньне дэмпінгавага вывазу на замежны рынак, кансэрваваньне тэхнічнай адсталасьці вытворства і інш. У выніку гэтага ў Польшчы ўмацаваўся манапалістычны капітал у найбольш паразытычных формах. І зараз адным з асноўных патрабаваньняў цяжкой індустрыі зьяўляецца патрабаваньне павышэньня цэн на яе прадукты, што яшчэ больш абцяжарыць разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці.

Колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных, паводле афіцыйных даных, у красавіку пачала памяншацца: 29 сакавіка яна дасягнула 295 тыс., а 3 мая панізілася да 273 тыс., 24 мая — 240 тыс., 7 чэрвеня — 227 тыс. Аднак, гэтыя даныя, бясспрэчна, пяноўны, бо яны не ахапляюць многіх беспрацоўных з дробнай прамысловасьці; падругое, пасьля 17 тыдняў многія беспрацоўныя механічна выключаюцца з рэгістрацыі беспрацоўных. Усё-ж такі і цры вялікай тэндэнцыі біржы працы да сьвядомага памяншэньня ліку зарэгістраваных беспрацоўных колькасьць зарэгістраваных беспрацоўных і цяпер яшчэ на 120 тыс. больш, чым летась. Калі да поўных беспрацоўных дадаць працуючых па 2-4 дні ў тыдзень, колькасьць якіх складае каля 30% усіх працуючых, дык агулам атрымаем, што ня менш 60 проц. усіх рабочых зьяўляюцца беспрацоўнымі і паўбеспрацоўнымі. Некаторае скарачэньне колькасьці беспрацоўных адбылося за апошнія месяцы, галоўным чынам, за кошт скарачэньня беспрацоўных будаўнікоў; некаторае памяншэньне адбылося таксама ў тэкстыльнай прамысловасьці, але там ужо пачынаецца зваротная хваля; скарачэньне рабочых у яжкой прамысловасьці і на чыгунках працягваецца.

Усё гэта сьведчыць аб вялізарным росьце супярэчнасьцяй у польскай прамысловасьці і аб бясспрэчным працэсе развалу капіталістычнай стабілізацыі.

Месячнік вывазу лесу

## *1.000 вагонаў дроў стаяць мёртвым грузам на станцыях*

**Па дакладу Саюзлесу аб становішчы забесьпячэньня БССР, у прыватнасьці, г. Менску дрывамі, СНК пастанавіў правесьці месячнік вывазу лесу. Паводле прыблізных падлікаў, месячнік па вывазу лесу павінен даць да 900.000 куб. мэтраў дроў, што поўнасьцю магло-б забясьпечыць патрэбнасьці насельніцтва гарадоў у дровах.**

**Саюзлес выпучыў сваіх прадстаўнікоў у акругі для ўзмацненьня дастаўкі дроў у Менск.**

**На станцыях Бабруйскае акругі загатоўлена каля 1.000 вагонаў дроў, якія магілеў-б быць адгружаны на працягу 10 дз

# Наблізім савецкі апарат да калгасу і вёскі

## Ліквідуючы акругі, умацуем раёны і сельсаветы

### Арганізавана па-баявому правядзем гэту адказьнейшую задачу

## Наркамзем павінен стаць штабам сацыялістычнай рэканструкцыі с.-г.

### Апарат Наркамзему пасьля ліквідацыі акруг (У ПАРАДКУ ПРАПАНОВЫ)

Камісія па рэарганізацыі зямельнага апарату, створаная пры НКЗ Беларусі у сувязі з ліквідацыяй акруг, закончыла сваю работу. На аснове работ гэтай камісіі НКЗ БССР склаў праект рэарганізацыі зямельнага апарату.

#### За Наркамземам застаюцца выключна плянава-кіруючыя і кантрольныя функцыі

Праект перабудовы апарату самога НКЗему выходзіць з патрэбнасьці і мэтазгоднасьці пакінуць за камісарыятам толькі выключна плянава-кіруючыя і кантрольныя функцыі, з перадачай усіх апэрацыйных функцый адпаведным трэстам і калгасна-каапэрацыйнай сыстэме. Толькі цьвёрдае выкананьне гэтай умовы дасьць магчымасьць НКЗ сапраўды стаць штабам сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і адначасова павялічыць адказнасьць трэстаў і калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы за правядзеньне мерапрыемстваў у галіне сельскай гаспадаркі. Гэтага патрабуе багаты вопыт мінулай работы.

Да апошняга часу трэсты і калгасна-каапэрацыйная сыстэма, часамі прыкрываючыся НКЗемам прабуюць звальваць на яго адказнасьць за нездавальняючае выкананьне імі тых ці іншых заданьняў. Пры ўдзеле, напрыклад, малочна-жывёлагадоўчага саюзу Наркамзем распрацаваў плян арганізацыі жывёлагадоўчых калгасаў з усімі дэталямі. Пасьля-ж некаторага часу малочна-жывёлагадоўчы саюз стаў адмаўляцца ад выкананьня намечанага пляну, спасылаючыся на ўсемагчымыя прычыны. Або, напрыклад, такі выпадак. На ільнаапрацоўчым заводзе, які будуецца ў Ляднянскім агра-індустрыяльным камбінаце, выяўлены сур'ёзныя заганы ў пабудове цяглянных сьцен. Белкалгасбуд — непасрэдны будаўнік і віноўнік галавацяпства абвінавачае ў гэтым... Наркамзем і інжынэра-тэхналёга яго плянавага сэктару, які зацьвярджаў будаўнічыя чарцяжы, што абавязан рабіць Белкалгасбуд. Аднак, пакуль не разабраліся ў гэтай справе, ні ў чым нявінаваты інжынэр быў над пагрозай зьняцьця з работы па 2-й катэгорыі.

#### Спрашчэньне апарату

Выходзячы з таго, што на камісарыят павінны быць укладзены выключна плянава-кантрольныя функцыі, намячаецца наступная структура яго апарату. Зусім ліквідуюцца сэктары: саўгасаў і абслугоўваньня сельскай гаспадаркі, якія дублявалі работу Белсельтрэсту і калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы. За лік гэтых сэктараў міркуецца ўзмацніць плянава-эканамічны сэктар са стварэньнем пры ім сэкцыі раённых плянаў, якая павінна будзе складаць пэрспэктыўныя і вытворчыя пляны непасрэдна ў раённым разрэзе. Апрача таго, прапануецца стварыць новую кантрольна-інструктарскую групу ў складзе 10 чалавек. Адзін інструктар павінен будзе абслугоўваць 10 раёнаў (у БССР 100 раёнаў), з прабываньнем у кожным з іх агулам ня менш аднаго месяца ў год. Інструктары зьявяцца шчупальцамі Наркамзему непасрэдна на мясцох.

У сувязі з прапанаванай структурай ня толькі не павялічваецца штат камісарыяту, але нават скарачаецца на 10—12 проц. Зараз працуе ў Наркамземе 150 чалавек, а маецца на ўвазе пакінуць толькі каля 127, прычым узмацненцца нават частка апарату, якая непасрэдна зьвязвае Наркамзем з раёнамі. Аслабанецца таксама 10 лішніх спэцыялістых, якія могуць быць перададзены вытворчым органам.

#### Рэарганізацыя зямельных аддзелаў

У раёнах праектам прадугледжваецца рэарганізацыя зямельных аддзелаў пры РВК у сэктары сельскай гаспадаркі райвыканкомаў. За рэканструкцыю сельскай гаспадаркі ў раёне павінен будзе цалкам і поўнасьцю адказваць ня толькі сэктар, але і райвыканком. Кіраўнік сэктару павінен абавязкова быць членам прэзыдыуму РВК. Розьніца паміж існуючым райза і намечаным сэктарам сельскай гаспадаркі ў тым, што зямельны орган быў адзраваны ад РВК, зьяўляючыся як-бы яго прыдаткам, падбудовай (райза і РВК вялі нават між сабой афіцыяльную перапіску), а сэктар сельскае гаспадаркі будзе адным з важнейшых сэктароў або аддзелаў райвыканкому, якім апошні і будзе кіраваць, нясучы за яго дзейнасьць поўную адказнасьць. Ператварэньне райзо з аддзелу пры РВК у сэктар сельскай гаспадаркі райвыканкому дазволіць максімальна ўвязаць дзейнасьць гэтага сэктару з дзейнасьцю іншых сэктараў і аддзелаў РВК.

Значна ўзрастае роля сэктару сельскай гаспадаркі РВК. Ён павінен карыстацца правамі акрэа, г. зн. капчаткова вырашаць на месцы ўсе спрэчныя пытаньні як у галіне зямлякарыстаньня, так і мэліярацыі і інш.

Сэктар сельскай гаспадаркі РВК нясе адказнасьць за ўсё с.-г. будаўніцтва ў раёне. Гэта зробіць немагчымым недарэчныя выпадкі, калі раёны ня ведаюць, якія аб'екты і па якой галіне сельскай гаспадаркі яны будуюць. Так выявілася, што Дрысенскі райза (Полацкая акруга) ня ведае, што ў яго раёне будуецца буйны ільно-апрацоўчы завод. Такі факт тлумачыцца адарванасьцю райза ад пытаньняў рэканструкцыі сельскае гаспадаркі, а таксама тым, што райза, як быццам кіруе ўсім, але фактычна ні за што не адказвае. На сэктар ускладаецца кантроль с.-г. будаўніцтва па ўсіх галінах.

Штат сэктару сельскай гаспадаркі РВК міркуецца павялічыць па 30—35 проц., выключна за лік спэцыялістых па важнейшых галінах сельскай гаспадаркі раёну, у залежнасьці ад таго, які кірунак мае гаспадарка ў раёне.

У сельсаветах праект прадугледжвае арганізацыю сэкцыі сельскай гаспадаркі, якой кіруе член сельсавету. Сэкцыя працуе па заданьнях аддзелу сельскай гаспадаркі РВК і асаблівую ўвагу зварочвае на пытаньні кадэктывізацыі і на масавыя, агранамічныя і зоатэхнічныя мерапрыемствы.

#### Ліквідаваць сыстэму вучастковай агранаміі

У сувязі з рэарганізацыяй зямельнага апарату НКЗ Беларусі лічыць патрэбным ліквідаваць сыстэму вучастковай агранаміі, перадаўшы яе калгасна-каапэрацыйнай сыстэме. Далейшае захаваньне сыстэмы вучастковай агранаміі па дуцы НКЗ зусім нямэтазгодна, бо яна не дапамагае сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. Куды мэтазгодней пры няўпасьці значнага недахвату с.-г. спэцыялістых, выкарыстаць 100 раённых агранамаў, якія ёсьць у БССР, па лініі калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы.

Кіраўніцтва вэтэрынарнай сеткай НКЗ лічыць патрэбным пакінуць за сабой.

**В. Л.**

## Твар сампрамкаапэрацыі пасьля рэформы

### (У парадку абгаварэньня)

Мерапрыемствы партыі і ўраду па ліквідацыі акруг павінны добра адбіцца на сыстэме саматужна-прамысловай каапэрацыі.

Існуючыя зараз формы і мэтады работы сампрамкаапэрацыі ні ў якім разе не забясьпечваюць кіраўніцтва і інструктаваньне з боку акруговых саюзаў сваёй пэрыферыі. У выніку мы маем прарывы ў выкананьні прамфінпляну ў лініі сампрамкаапэрацыі.

Таму працаўнікі сампрамкаапэрацыі павінны зараз жа ўзяцца за правядзеньне ў жыцьцё пастаноў партыі і ўраду аб ліквідацыі акруговых зьвяньняў свайго апарату. Віцебскі саюз сампрамкаапэрацыі ўжо абмеркаваў гэта пытаньне і вызначыў наступны праект ліквідацыі акруговага зьвяна.

Існуючае зараз у большасьці раёнаў Віцебскай акругі куставое аб'яднаньне арцеляй застаецца, як асноўная арганізацыйная форма сампрамкаапэрацыі ў раёнах. Куставыя аб'яднаньні арганізуюцца ў тых раёнах, дзе сампрамкаапэрацыя мае некалькі арцеляй, прыкладна, ня менш 3-х. Члены ўсіх арцеляй на агульным сходзе выбіраюць праўленьне, якое кіруе ўсімі арцелямі раёну. Праўленьне абслугоўвае арцелі, як па арганізацыйнай, так і вытворчай і культурнай галінах. Пры праўленьні ёсьць агульная бухгальтэрыя, дзе сканцэнтравана рахункаводзтва ўсіх арцеляй раёну. Рахункаводзтва аддзелена так, што адбівае становішча кожнай арцелі паасобку. На чале кожнай арцелі знаходзіцца загадчык, які адказвае за ўсю работу арцелі, сваячасовае выкананьне прамфінпляну, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва і г. д. Сродкі і сыравіна паступаюць на імя раённага аб'яднаньня, якое ўсё гэта рызьміркуе паміж паасобнымі арцелямі.

Для забесьпячэньня раёнаў розпай сыравінай у Віцебску арганізуецца база Белсампрамсаюзу для абслугоўваньня цэнтрашніх Віцебскай і Полацкай акруг. Штат раённага аб'яднаньня, прыкладна, складаецца з 7 асоб, у тым ліку старшыня, яго намесьнік, эканамісты, два інструктары, дзелавод і бухгальтар. Усе сродкі і маемасьць арцелі зьяўляюцца цэнтралізаванымі. Ніякіх процантных надбавак за тыя, ці іншыя апэрацыі праўленьне ня робіць. Арганізацыйныя выдаткі прапарцыянальна разьмяркоўваюцца паміж арцелямі.

У горадзе замест акруговага саюзу арганізуецца гарадзкі саюз сампрамкаапэрыі. Функцыі гарадзкога саюзу тыя ж самыя, што і ў акруговага. На чале саюзу знаходзіцца праўленьне з 5 асоб. Забесьпячэньне гарадзкога саюзу сыравінай робіцца праз базу Белсампрамсаюзу.

Нагляд за рыбалоўнай справай і выпрабам нератаў перадаецца Белрыбе. Штаб гарадзкога саюзу, прыкладна, вызначаецца ў 20 чалавек.

Рэарганізацыю сампрамкаапэрацыі ў Віцебскай акрузе памячаецца скончыць да 1-IX-1930 г.

**Фрэйдзінзон.**

## Ліквідацыя акруг і задачы рабселькораў

Пасьпяховае разгортваньне індустрыялізацыі, якое высунула аусім рэальны лёзунг — выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, буйны рост калгаснага руху, рашучы паварот серадняцкіх мас да сацыялізму, новыя суадносіны клясавых сіл у краі, ліквідацыя кулацтва як класы на базе суцэльнае калектывізацыі — усё гэта ўпарта патрабуе ня толькі найбольш хуткага, рашучага замацаваньня вузлавога пункту сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы, раёну, але і аднаведнай перабудовы цэнтральных і акруговых кіруючых органаў. Трэба, каб безадкладна была ўстаноўлена непасрэдная сувязь з раёнамі.

XVI партзьезд і ЦК УсеКП(б) прапанавалі перабудаваць работу ўсіх цэнтральных апаратаў пад лёзунгам **«тварам да раёну, да вёскі»**. Гэта значыць, што трэба ўзмацніць апараты партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных арганізацый, выканкомаў і ўсіх савецкіх устаноў, **каб былі забясьпечаны непасрэдная сувязь з раёнамі і кіраўніцтва работай раённых арганізацый.**

Самыя лепшыя кадры партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый павінны быць кінуты ў раёны, у вёскі.

**Усе гэтыя мерапрыемствы павінны быць праведзены ў самым тэрміновым парадку,** бо ад таго, як хутка перабудуюцца партыйныя, прафэсыянальныя і савецкія органы, ня ў малой ступені будзе залежыць пасьпяховасьць практычнае работы па ліквідацыі акруг, пасьпяховасьць усяе работы па ўзмацненьні раёну.

**Таму актыўная дапамога з боку ўсіх грамадзкіх арганізацый, у тым ліку і рабселькораў, патрэбна больш, як калі.**

Рабселькоры, як грамадзкія працаўнікі, **якія павінны быць застрэльшчыкамі і ўдарнікамі ва ўсіх важнейшых мерапрыемствах партыі і савецкага ўраду,** асабліва ў гэтым пытаньні **павінны прымаць самы актыўны ўдзел.**

Рабкор і селькор спатыкаюцца з фактамі скрыўленьня клясавай лініі, ігнараваньнем дырэктыў і пастаноў кіруючых партыйных і савецкіх органаў, з непрацаздольнасьцю асобных нізавых партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і савецкіх органаў у раёне, на вёсцы. Рабселькоры пішуць аб гэтых недахопах у цэнтральныя і акруговыя газэты, а таксама ў нізавым друку (шматтыражкі, насьценныя газэты). Рабселькоры значна дапамагаюць партыі і савецкай уладзе зьнішчаць гэтыя недахопы і паленьшыць работу нізавых органаў.

**Пасьпяховасьць правядзеньня ліквідацыі акруг будзе залежыць у значнай меры ад умелай рэарганізацыі апарату партыйных, камсамольскіх, прафэсыянальных і савецкіх органаў. І тут вялікую дапамогу могуць прынесьці рабселькоры.**

**Усякая добрая прапанова аб лепшай** рэарганізацыі апарату і скарыстаньні работнікаў цэнтральных і акруговых органаў **прынясе шмат карысьці і паскорыць тэмпы правядзеньня ліквідацыі акруг.**

Рабселькоры павінны ўжо зараз паўдарнаму ўзяцца за гэту работу. **Трэба зьвязацца са створанымі камісіямі па ліквідацыі акруг, па рэарганізацыі апарату.** Рабселькоры павінны шырока асьвятліць у цэнтральным і нізавым друку ход ліквідацыі акруг. Пісаць аб сваіх прапановах. **Пры ўсіх рэдкалегіях шматтыражак і насьценных газэт стварыць рабкораўскія брыгады для дапамогі камісіям у правядзеньні гэтай вялікай работы.**

Разам з гэтым, перад масавымі аддзеламі рэдакцый цэнтральных і раённых газэт **стаіць таксама баявая задача — перабудаваць і сваю работу пад лёзунгам «тварам да раённай газэты, да сельскораў»,** бо ў сувязі з ліквідацыяй акруг, лік друкаваных шматтыражак у буйных вясковых раёнах БССР будзе значна павялічаны і разам з гэтым будзе і значны прыцёк новых рабселькораў, якіх масавым аддзелам рэдакцый прыдзецца лепш абслугоўваць, інструктаваць, чым гэта было раней.

Кіраўніцтва рабселькорамі, у сувязі з ліквідацыяй акруг, павінна быць рэарганізавана на новых пачатках, прыстасавана да новых запатрабаваньняў.

Трэба спадзявацца, што рабселькоры Беларусі зойміць самае пачэснае месца ў гэтай рабоце шляхам сапярніцтва, якое мы вядзем з рабселькорамі Смаленшчыны.

Рэдакцыя газэты «Зьвязда» заклікае рабселькораў абвясьціць сябе ўдарнікамі па ў дзелу ў ліквідацыі акруг, на ажыцьцяўленьні пастаноў XVI зьезду УсеКП(б).

**Ц—н.**

# Будаўніцтва мясных фабрык

## пад пільны кантроль пралетарскай грамадзкасьці

### Калгасы і саўгасы БССР, бярэце прыклад з калгасу „Расьсьвет-Пераможца"

## Калгас „Расьсьвет-Пераможца"— уперадзе

**Калгас «Расьсьвет-Пераможца». (Жлобінскі раён) дэталёва абгаварыў ліст сакратара ЦК КП(б)Б т. ВАСІЛЕВІЧА аб вырашэньні мясной праблемы і разьвіцьці сьвінагадоўлі. Навакол пытаньняў, высунутых т. Васілевічам мабілізавана грамазная думка і актыў-насьць усіх калгасьнікаў, каб хутчэй ажыцьцявіць мерапрыемствы па разьвіцьці сьвінагадоўлі.**

**Ня гледзячы на тое, што калгас «Расьсьвет—Пераможца» ня быў уключаны ў раённы плян будаўніцтва сьвінарнікаў, калгасьнікі ўжо прыступілі да ўкамплектаваньня сьвіннога стада і пабудовы сьвінарніка.**

**Мы дабіліся ўключэньня калгасу ў раённы плян будаўніцтва сьвінарнікаў і атрымалі 10 тыс. руб. крэдыту. Да 1-га кастрычніка будзе пабудаваны новы сьвінарнік на 150 матак, куды будуць пераведзены 50 дарослых матак, 30 падсьвінкаў і 8 хракоў белай ангельскай пароды, якія ўжо маюцца ў калгасе. Рэштка будзе закуплена ў раёне.**

**Калгас зараз праз Жлобінскі райкалгассаюз перадае 20 пародзістых трохмесячных хракоў для ўкамплектаваньня сьвіных гаспадарак раёну.**

**Мы лічым, што вырашэньне мясной праблемы і забесьпячэньне мясными прадуктамі прапетарскіх цэнтраў, магчыма толькі пры мабілізацыі актыўнасьці ўсіх калгасьнікаў Беларусі на выкананьне гэтай найважнейшай справы.**

**Старшыня калгасу ФІЛІЁНАЎ.**
**Заг. сьвінагадоўлі КАНАПЛЕЎ.**

**Калгас «Расьсьвет Пераможца».**
**29-VII—30 г.**

## Петрыкаўскія раённыя арганізацыі ў баку

У Петрыкаўскім раёне (Мазырщчына) на пляне павінна было распачацца будаўніцтва 7 сьвінаводных калгасаў. Фактычна да будаўніцтва пакуль што прыступілі толькі 3 калгасы. Рэшта толькі зараз пачала вывозіць лесаматар'ялы. Галоўнай перашкодай у будаўніцтве сьвінарнікаў зьяўляецца недахоп дягавай сілы ў калгасах для перавозкі будаўнічых матар'ялаў.

Кулацтва, якое баяць у будаўніцтве сьвінарнікаў гаспадарчае замацаваньне калгасаў, імкнецца ўсімі спробамі сарваць яго. Між тым, раённыя арганізацыі не мабілізавалі грамадзкую думку калгасьнікаў вакол гэтай справы. Партыйная і камсамольская арганізацыі стаяць у баку ад гэтага важнейшага гаспадарчага мерапрыемства. РВК і райпаляводсаюз таксама ня ведаюць, як ідзе будаўніцтва сьвінных гаспадарак у калгасах.

**Брыгадзір «Зьвязды»**
**ТОЎСЬЦІК.**

## Дзе інжынэры і тэхнікі агракамбінату?

У Ляднянскім раёне (Аршаншчына) да пытаньняў разьвіцьця жывёлагадоўлі, а асабліва сьвінагадоўлі алносяцца вельмі нядбайна. У раёне фактычна гэтай справай ніхто ня хоча займацца, ня гледзячы на тое, што ў плян намечана арганізаваць 3 сьвінных множнікі на 96 матак і 1.000 падсьвінкаў кожны, 2 малочныя гаспадаркі і 2 выхавальнікі цялят. Але ўсё гэта толькі ў плянах. На справе-ж райпаляводсаюз нават ня вызначыў, дзе будаваць гэтыя гаспадаркі. Апрача гэтага на калгасах намячалася пабудаваць 13 сьвінарнікаў. Дагэтуль не пабудавана ніводнага, ня гледзячы на тое, што на будаўніцтва іх адпушчана звыш 48 тыс. руб. Між тым, на тэрыторыі раёну знаходзіцца агракамбінат, дзе ёсьць і тэхнікі, і інжынэры, якія фактычна ні чога ня робяць.

Для будаўніцтва ўжо адпушчана 4 тыс. куба-метраў лесаматар'ялаў, якія не скарыстоўваюцца. У раёне шмат будынкаў раскулачаных кулакоў, але яны не скарыстоўваюць, а разбазарваюцца. Агракамбінат будаўніцтвам сьвінных гаспадарак зусім ня цікавіцца.

Ня лепш абстаіць справа і з кантрактацыяй жывёлы. Паводле пляну намечана закантрактаваць на калгасах 68 шт. цялят, закантрактавана ўсяго 36 штук, у індывідуальным сэктары намечана закантрактаваць 362, пакуль што не закантрактавана ніводнага. Такая справа і з сьвіньнямі. У гэты самы час некаторыя калгасы рэжуць сьвіней, як у Бельскім сельсавеце. У некаторых месцах сяляне рэжуць кароў і прадаюць на рынку.

**Брыгадзір «Зьвязды»**
**МАЦЮКОЎ.**

## Віцебскі РВК „дапамагае"

Замест таго, каб дапамагчы калгасам у будаўніцтве жывёлагадоўчых гаспадарак, Віцебскі РВК сам тармозіць яго. Вось факты. На аддлегласьці 1 км. ад калгасу імя 1-га мая ёсьць цагельня, дзе калгас яшчэ два месяцы тому назад умовіўся ўзяць 30 тыс. штук цэглы. Гэтымі днямі калгас павінен ужо быў прыступіць да вываазкі цэглы, але чамусьці Віцебскі РВК гэтую цэглу забраў на іншыя мэты, калгасу-ж РВК прапанаваў ехаць за 45 клм. Будаўніцтва затрымліваецца за адсутнасьці цэглы.

Калі старшыня калгасу паставіў гэтае пытаньне на разгляд бюро РК, старшыня РВК заявіў: «Калгас гэта не дзяржаўная арганізацыя, даставайце цэглу, як самі ведаеце». Старшыня РВК зараз замяшчае сакратара РК, таму па яго прапанове бюро РК гэтае пытаньне нават і не разглядала. Вось як Віцебскі РВК кіруе будаўніцтвам.

**Брыгадзір «Зьвязды»**
**ФРОЛАЎ.**

## Да будаўніцтва сьвінарнікаў амаль ня прыступілі

Будаўніцтва сьвінных гаспадарак у Ветрынскім раёне (Полаччына) зрываецца. Большасьць калгасаў ня вывезьлі лесу для будаўніцтва сьвінарнікаў. Многім калгасам нават не адведзены лес. Калгас «Чырвоны Сьцяг», які павінен быў пабудаваць сьвінарнік і загатовіць 96 сьвінаматак, нічога не зрабіў. Вызначаныя для гэтай мэты каля 8 тыс. руб. ляжаць бяз усякага руху.

Саўгас «Банань», які павінен загатовіць 1.000 сьвіней і пабудаваць сьвінарнікі для іх, таксама не распачаў будаўніцтва. Для будаўніцтва не хапае цесьляроў і камянщыкаў. Райкалгассаюз купіў вагон цамэнту, але Полацкі акрпаляводсаюз гэты цамэнт скарыстаў для сваіх мэт і прыслаў у Ветрын толькі 9 бочак. Раён павінен выдаткоўваць на будаўніцтва 60 тыс. руб. штомесячна, пакуль што выдаткавана 15 тыс. руб. Калі гэтак справа будзе працягвацца і надалей, дык будаўніцтва сьвінных гаспадарак у Ветрынскім раёне будзе сарвана.

**Брыгадзір «Зьвязды»**
**НІКІЦІН.**

*Пазыка „Пяцігодка—за чатыры гады"*

# Камісіі садзейнасьці ня сталі яшчэ баявымі штабамі змаганьня за пяцігодку

### Другі налёт рабочых брыгад на фабзаўкомы і нізавыя камісіі садзейнасьці

ЦКСБ і Менская акруговая камісія садзейнасьці арганізавалі другі налёт на фабзаўмясцкомы і камісіі садзейнасьці.

Гэты налёт рабочых брыгад вывіў памылкі і недахопы, якія перашкаджаюць разгортваньню кампаніі рэалізацыі пазыкі

#### Дзе добра ідзе падпіска

Цытаньне аб пазыцы «Пяцігодка — за чатыры гады» сваячасова абмяркоўвалася на бюро партячэйкі, прафактывае і на агульным сходзе рабочых **абутковых майстэрань Дзяржбуду.** Дзякуючы добрай падрыхтоўцы, рэалізацыя пазыкі праходзіць з посьпехам. Падпіскай ахоплены ўсе 100 роц. рабочых, за выключэньнем адпускных. **Агульная сума складае больш за 100 проц. двухтыднёвага заработку.** Насьценгазэта пры майстэрні прымае належны ўдзел у асьвятленьні кампаніі. У «Кутку падпісчыкаў» штодзень вывешваецца зводка падпіскі. Майстэрні ўступілі ў спаборніцтва са шчацінным фабрыкай.

#### „Мяккасэрдны" камсод

Добра ідзе рэалізацыя пазыкі і папулярызацыя дзяржкрэдыту па **калектыве Менскай акруговай ашчаднай касы.** Па ініцыятыве камсоду арганізавана ўдарная брыгада па праверцы выгрышаў. Ударнікі ў выхадныя дні дапамагаюць крэдытным установам абсьледваць і інструктаваць нізавыя камсоды.

Арганізаваны стол даведак, які добра абслугоўвае пазыкатрымальнікаў.

У калектыве 104 чалавекі, іх падпіскай ахоплена 70 ці каля 70 проц. Пад піска дасягнула 5.000 руб., што складае 104 проц. двухтыднёвага заработку. Камісія садзейнасьці ўступіла ў спаборніцтва з камісіяй Дзяржбанку і заводу «Вальшавік». Самае слабое месца работы камісіі ашчадкасы — **гэта грамадзкі кантроль.** Варта толькі падаць невялікую пісульку доктара аб неабходнасьці лепшага харчаваньня, ці каму-небудзь заплакаць, як «мяккасэрдныя» члены камісіі адразу даюць дазвол на продаж, або заклад аблігацый.

#### Каму трэба падцягнуцца

Слаба праведзена падрыхтоўка да кампаніі па калектыву **Аўтатранспарту.** Там лагэтуль яшчэ няма камісіі садзейнасьці. Падпісалася толькі 325 чалавек па суму 6.355 руб. ці 44 проц. двухтыднёвага заработку. Рабочыя майстэрань уступілі ў спаборніцтва з шофэрамі, але вынікаў спаборніцтва яшчэ няма, бо ніхто ня кіруе гэтай работай. Насьценгазэта не мабілізавала вакол сябе актыву, не арганізавала грамадзкай думкі вакол пазыкі.

Мала што зроблена на **заводзе «Энэргія».** З 950 рабочых падпісалася 557, ці 55 проц. Агульная сума падпіскі складае 31.000 рублёў — 68 проц. двухтыднёвага заработку. Рэдкалегія мала ўвагі аддае ходу рэалізацыі. Партячэйка слаба кіруе падпіснай кампаніяй.

**На малочным заводзе** да 24-га ліпеня зусім ня было камісіі садзейнасьці і ніякай работы не праводзілася. З 45 рабочых самацёкам падпісалася 27 чалавек, ці 60 проц. на суму 1.610 рублёў, што складае 45 проц. зарплаты. **Аб спаборніцтве на заводзе зусім ня чуваць.** Насьценгазэта не зацікаўлена пазыкай.

Неарганізавана праходзіць падпіска на менскім кахляным заводзе. Ахоплена 67 проц. на суму 1.645 руб., што складае 82 проц. заработнай платы за два тыдні. Наогул, рэалізацыя на заводзе праходзіць самацёкам, без усякай падрыхтоўкі, зусім адсутнічае растлумачальная работа.

За апошнія часы разгарнулася кампанія па хлабзаводзе **МЦРК.** На пазыку падпісалася 58 проц. рабочых на суму 8.000 рублёў. На заводзе ёсьць 20 сэзоньнікаў, якія яшчэ не ахоплены падпіскай.

#### Новая камісія — іншая работа

Новая камісія садзейнасьці ў **Наркамфіне** пачала працавацца пасьля роспуску старой камісіі яна ўлічыла ўсе памылкі, выяўленыя пры праверцы работы камсоду, і ўзяла правільны напрамак у рабоце. Асабліва чула адносяцца члены камісіі да дразгляду заяў на продаж і заклад аблігацый.

Калектыў Наркамфіну ўступіў у сацспаборніцтва з заводам «Энэргія» і другімі установамі, а таксама ўзяў шэфства над Сьмілавіцкім раёнам для дапамогі рэалізацыі.

З агульнага ліку служачых каля 100 чалавека, на пазыку падпісалася 84 чалавекі на суму 9.415 руб., што складае **146 проц. двухтыднёвае зарплаты.** 15 служачых падпісаліся на месячны заработак.

#### „Бяз усякай цяганіны"

Камсод **заводу «Чырвоны Хэмік»** зусім адмовіўся ад «папяровай цяганіны». Ён лічыць, што справа ня ў тым, што запішаш у пратакол, а ў тым, як выканаеш справу. У выніку ніякага сапраўднага грамадзкага кантролю над аблігацыямі няма. Члены камісіі распараджаюцца аблігацыямі як сваёй уласнасьцю. Няма ніякага ўліку паступаючых заяў. Разгледжаныя заявы ў пратаколах ня фіксуюцца. На паданую заяву аб продажы пакладаецца рэзалюцыя, пасьля чаго даецца даведка і... калі ласка. Сярод заяў на продаж аблігацый фігуруе і заява самога старшыні камісіі. Як падабае заяве старшыні, на ёй зусім няма ніякіх рэзалюцый. Дазволы даваліся няправільна, без грунтоўных падстаў. Так, напрыклад, далі дазвол на продаж аблігацый з прычыны «маладкроўя».

Лепш стаіць справа з падпіскай па новую пазыку. З 60 рабочых падпісалася 47, ці 78 проц. на суму 1.750 руб., што складае 88 проц. двухтыднёвай зарплаты ўсяго заводу. Насьценгазэта ў кампаніі ня прымае ніякага ўдзелу, растлумачальная работа праводзіцца вельмі слаба.

#### Для каго патрэбен грамадзкі буксір

Дрэнна праходзіць рэалізацыя пазык па калектыве **менскага акруговага выканўчага камітэту.** Мясцовы і камсод пальцам не паварушылі, каб растлумачыць служачым значэньне кампаніі. Ячэйка стаіць у баку ад кампаніі, ніхто ня кіруе апошняй. Самацёк пануе ў калектыве АВК.

На 26-га ліпеня падпіскай ахоплены 21 чалавек, ці 33 проц. служачых на агульную суму 2.300 руб. — 56 проц. двухтыднёвага заработку.

Камісія садзейнасьці існуе толькі на паперы. Усю работу па падпісцы праводзіць адзін чалавек. Усе грамадзкія арганізацыі АВК ня цікавяцца пазыкай.

Шмат служачых зусім не падпісваюцца з прычыны... ліквідацыі акругі: «мы ня ведаем, дзе будзем працаваць і ці будзем працаваць, таму ня можам падпісацца». Гэткія настроі пануюць у калектыве з-за поўнай бязьдзейнасьці грамадзкіх арганізацый. Калектыў АВК трэба ўзяць на грамадзкі буксір.

**БІРШТЭЙН.**

## Першыя вынікі

**З акруг БССР пачалі паступаць весткі аб папярэдніх выніках падпіскі на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».**

**Па г. ВІЦЕБСКУ падпіска дала ўжо 450 тысяч рублёў.**

**Рабочыя і служачыя г. ВОРШУ падпісаліся на 96.860 руб.**

**Паводле апошніх вестак, падпіска на пазыку па ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУЗЕ дасягнула 170 тысяч руб.**

**Да 1-га жніўня падпіска на новую пазыку па ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУЗЕ дала каля 200.000 руб.**

**З посьпехам праходзіць падпіска сярод рабочых г. БАРЫСАВА. На 1-га жніўня падпіска дасягнула 100.000 рублёў.**

## На барацьбу з цякучасьцю рабочай сілы мабілізаваць рабочую грамадзкасьць

### УДАРЫЦЬ ПА ДЭЗАРГАНІЗАТАРАХ РЫНКУ ПРАЦЫ!

На нашых прадпрыемствах зараз адчуваецца востры недахват у кваліфікаванай рабочай сіле. Пры такім становішчы цякучасьць рабочай сілы, якая на некаторых прадпрыемствах мае вялікія разьмеры, моцна б'е па нармальнай рабоце прадпрыемства і выкананьні прамфінпляну. Лічбы цякучасьці рабочай сілы па заводу «Энэргія», якія прыводзіў т. Праўдзін у «Зьвязьдзе» ад 15 ліпеня (70 проц.), зьяўляюцца характэрнымі і для раду іншых прадпрыемстваў. Ёсьць заводы, дзе цякучасьць рабочай сілы нават перавышае 70 проц. (фанэрны завод у Віцебску).

Якія-ж прычыны павялічваюць цякучасьць рабочай сілы? Адзін з такіх прычын зьяўляецца нармальная разьбежка ў зарплаце **аднолькавых груп рабочых** розных прадпрыемстваў. У пошуках кваліфікаванай рабочай сілы некаторыя адміністратары, падыходзячы да гэтага пытаньня выключна са сваёй вазіцы, ня лічацца з вызначанымі стаўкамі зарплаты і даюць лішні рубель у дзень або вызначаюць больш разрад. Больш частымі сталі выпадкі пераманьваньня рабочых шляхам абяцаньня больш высокіх ставак і разрадаў. **Самі адміністратары павялічваюць цякучасьць рабочай сілы як на іншых прадпрыемствах, так і на сваіх уласных,** з аховтай прымаючы на работу звольненых за прагулы з іншых прадпрыемстваў. Можна было-б расказаць шмат выпадкаў, калі адміністрацыя заводу «Энэргія» прымала на работу рабочых, звольненых з «Камунара», калі адміністрацыя «Камунара» прымала на работу рабочых, звольненых з «Энэргіі», а мэханічныя майстэрні «БСКА» на Ляхаўцы пераманьвалі рабочых як з «Энэргіі», так і з «Камунара». А майстэрні ДЭТ'у прымаюць на работу **не зволенага з «Камунара»** токара, самі гэтым даючы магчымасьць рабочаму высоўваць рвацкія патрабаваньні.

Адначасова павялічыўся масавы наём рабочай сілы «от ворот», з чым калісьці вялася жорсткая барацьба.

Такім чынам, адміністратары нашых прадпрыемстваў у пагоні за лепшай рабочай сілай **самі дэзарганізуюць рынак працы.**

**Рабочай сілы—аднэй з асноўных прычын не выкананьня прамфінпляну—трэба ў першую чаргу моцна ўдарыць па дэзарганізатарах рынку працы,** забараніўшы як наём рабочай сілы «от ворот», так і пераманьваньне рабочых другіх прадпрыемстваў і самавольнае павялічэньне ставак зарплаты.

З другога боку трэба мабілізаваць шырокую рабочую грамадзкасьць на барацьбу з цякучасьцю рабочай сілы. Зусім правільная зьяўляецца прапанова таў. Праўдзіна пасьледваць прыкладу вытворчай камуны імя XVI партзьезду заводу «Энэргія» і шырока папулярызаваць уключэньне ў сацдагаворы пункту—**не пакідаць заводу да канца пяцігодкі.** Толькі пад уплывам пралетарскай грамадзкасьці можна будзе найбольш пасьпяхова разгарнуць барацьбу з цякучасьцю рабочай сілы.

Па маёй думцы прафсаюзы і органы працы павінны павесьці шырокую растлумачальную кампанію аб значэньні такога абавязацельства перад сацыялістычнай прамысловасьцю кожнага сьвядомага рабочага і дабіцца, каб гэты ўдарнікі заводу «Энэргія», быў распаўсюджаны на ўсе прадпрыемствы. Нельга абыйсьці моўчкі такога факту, што да гэтага часу ня толькі прафсаюзныя арганізацыі, але і органы Наркампрацы **нічога не зрабілі для барацьбы з цякучасьцю рабочай сілы.**

**Я. НАЖНІЦКІ.**

## Паслабленьне працдысцыпліны азначае паслабленьне масава-выхаваўчай работы

За апошні час наглядаецца некаторае паслабленьне ўвагі да пытаньняў працдысцыпліны. Такое становішча, бязумоўна, дрэнна адбіваецца на выкананьні прамфінпляну.

Матар'ялы аб спагнаньнях за парушэньні працдысцыпліны на прадпрыемствах БССР за першы квартал багучага году, а таксама апошніх абсьледваньняў сыгналізуюць, што замест узмацненьня працдысцыпліны на многіх прадпрыемствах наглядаецца адваротнае.

На некаторых прадпрыемствах процант рабочых, якія атрымалі тыя ці іншыя спагнаньні, даходзіць да 10. Гэтая лічба прымушае біць трывогу. Трэба адначыць, што на першым месцы па колькасьці выпадкаў парушэньня працдысцыпліны знаходзіцца **хэмічная прамысловасьць,** якая дае каля 45 проц. усёй колькасьці спагнаньняў. На другім месцы — **дрэваапрацоўчая прамысловасьць.**

Самае большае месца ў характары парушэньня працдысцыпліны займаюць выпадкі парушэньня правілаў унутранога распарадку, як спазьненьні, прагулы, кіданьне работы раней устаноўленага часу, Гэты характар парушэньняў складае 38,2 проц.

Значны процант парушэньняў падае на н

# Перад усебеларускай выстаўкай

## Выстаўка—школа ўзорнай жывёлагадоўлі

**(Гутарка з членам прэзыдыуму выстаўкі т. Сяргейчыкам**

Развіццё жывёлагадоўлі ў БССР мае перад сабой вялікія пэрспэктывы. У БССР ёсьць адпаведная кармавая база для разьвіцьця гэтай галіны сельскай гаспадаркі.

Вось чаму і на першай усебеларускай выстаўцы сельскае гаспадаркі і прамысловасьці значнае месца адведзена жывёлагадоўлі.

У гэтым кірунку задача выстаўкі паказаць тыя дасягненьні, якія мае БССР у галіне разьвіцьця жывёлы і, галоўнае,—у апрацаваным выглядзе паказаць экскурсантам той вялікі вопыт у жывёлагадоўлі, які ёсьць у нашых калгасах, саўгасах, бядняцка-серадняцкіх гаспадарках.

З усёй малочнай жывёлы, якая ёсьць на Беларусі, ужо вызначылася свайй чвілікай малочнасьцю чырвоная беларуская карова. Выстаўка і паказвае тыя посабы гадоўлі і догляду чырвонай беларускай каровы, якія спрыяюць павялічэньню яе малочнасьці і жывой вагі. Правільнае разьмеркаваньне кармоў, ізоўныя тыпы будынкаў для адпаведнай жывёлы, абсталяваньне будынкаў, правільнае захаваньне гною—усё гэта навучыць тых, хто наведае выстаўку, тым мэтадам і шляхам, якія ўзьнімуць прадукцыйнасьць жывёлагадоўлі.

Разам з паказам вопыту і дасягненьняў у галіне жывёлагадоўлі на выстаўцы паказаны і тыя шляхі, па якіх павінна разьвіцца жывёлагадоўля ў бліжэйшыя часы.

Перабудова дробнай жывёлагадоўчай гаспадаркі ў буйную калектыўную з мэханізацыяй некаторых працэсаў гаспадаркі—справа бліжэйшага часу. Аўтаматычная падача кармоў, вываз гною, мэханічнае паеньне і даеньне, паказаныя на выстаўцы, павінны ўжывацца ў калгасах і саўгасах. Гэта паленшыць догляд за жывёлай, будзе спрыяць хутчэйшаму разьвіцьцю буйнай жывёлагадоўчай гаспадаркі і аслабаніць шмат рабочых рук, якія могуць быць выкарыстаны на іншай рабоце.

На выстаўцы таксама паказана база, на якой ня толькі будзе вырашацца мясная праблема, але з якой вырасьце бэконная прамысловасьць. Тут паказаны спосабы кармленьня і гадоўлі сьвіней з вялікай жывой вагой.

У аддзелах палявой гаспадаркі экскурсанты азнаёмяцца з тыпамі шматпалёвых севазваротаў для кожнага гаспадарчага раёну БССР, з тым, што і дзе трэба сеяць і як трэба гадаваць тую ці іншую расьліну. Высокая ўраджайнасьць палёў будзе сама агітаваць за калектыўныя формы апрацоўкі. Там-жа экскурсанты ўбачаць новыя культуры эбожжавых кармовых расьлін і той эфэкт, які атрымліваецца ад іх разьвядзеньня.

Сад, які знаходзіцца на выстаўцы, хоць у мініятуры, але ўсё-ж зьяўляецца прыкладам калгасных і саўгасных садоў у падборы асартымэнту дрэў, разьмяшчэньні апыляльнікаў і скарыстаньня міжрадзьдзя пад высока-інтэнсыўныя культуры.

Тут-жа будуць працаваць сельскагаспадарчыя машыны і прылады і будзе паказана арганізацыя работы трактарных калён.

Экскурсанты, азнаёміўшыся з усімі экспанатамі выстаўкі, пройдуць вялікую школу, і навыкі, здабытыя ў ёй, перанясуць на свае палі.

**Я. Сьнежны.**

АГУЛЬНЫ ВЫГЛЯД ВЫСТАЎКІ

# Сёньня адкрываецца IX усебеларускі зьезд будаўнікоў

Пэрыяд ад кастрычніка 1928 году, які ахапляе каля 2-х год работы беларускай арганізацыі саюзу будаўнікоў, зьяўляецца пэрыядам шырокага будаўніцтва і вельмі вялікага ўзросту капітальных укладаньняў у справу індустрыялізацыі БССР.

На будаўніцтве ў БССР на ліпень 1928 г. працавала будаўнічых рабочых 36.000 чал., а на ліпень 1930 г. лік рабочых павялічыўся да 97.000. Будуецца Асінаўская ім. т. Сталіна электрастанцыя, якая яшчэ ў бягучым годзе дасьць электраэнэргію для нанава пабудаваных і існуючых фабрык і заводаў, разгортваецца будаўніцтва Гомельскай электрастанцыі, пабудаваны гіганты-заводы—бабруйскі камбінат, шаўковая фабрыка, скураны завод (у Магілеве), швэйная і панчошна-трыкатажная фабрыка ў Віцебску, заводы с.-г. машын, дрэваапрацоўчы камбінат у Гомелі і г. д. Шырока разгарнулася дарожнае, транспартнае, жыльлёвае і калгаснае будаўніцтва.

Шпарка растуць рады саюзу будаўнікоў. Так, напрыклад, на 1-е ліпеня 1930 году налічвалася 24.757 членаў саюзу, а на 1-е ліпеня 1930 году — каля 33.750 членаў саюзу. Сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам ахоплена 47 проц. рабочых, узрастае актыўнасьць будаўнікоў у справе ажыцьцяўленьня пяцігодкі ў чатыры гады.

Для кіраўніцтва гаспадарчай, савецкай, каапэрацыйнай і прафсаюзнай работай вылучана за апошні год 410 лепшых рабочых з вытворчасьці.

Падрыхтаваны малодшы камандны гаспадарчы склад з рабочых у колькасьці 945 чал. Арганізавана 7 школ будаўчуч ў ліку 600 чал.

За справаздачны пэрыяд будаўнікі прымалі шырокі і актыўны ўдзел ва ўсіх палітычных кампаніях, што пацьвярджаецца радам лічбаў: дзень індустрыялізацыі даў 135.500 руб., пабудаваны на сродкі працоўных самалёт «Чырвоны Будаўнік Беларусі» ў адказ на напад на Кітайска-Ўсходнюю чыгуна; рэалізавана 2-й і 3-й пазык індустрыялізацыі ў 1929 годзе на суму 75.548 руб. Зараз разгортваецца масавая работа на рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады» і да сёньняшняга дня падпіска дасягае 530.000 руб.

Саюз будаўнікоў прымаў актыўны ўдзел у сацыялістычнай перабудове вёскі праз сотні рабочых брыгад, якія пасылаліся на перавыбары саветаў, весьлі пасеўную кампанію, правядзеньне калектывізацыі і рамонт с.-г. машын і інвэнтару.

За гэты пэрыяд у рабоце саюзных і гаспадарчых будаўнічых арганізацый дапушчан рад памылак. Перабудова саюзнай работы, ня гледзячы на актыўны ўдзел шырокіх колаў рабочых у апошняй перавыбарчай кампаніі рабочкомаў, праходзіць яшчэ марудным тэмпам і не добраахвотнікаў у штодзённую агульнамасавую работу ня стала яшчэ шырокім, масавым зьявішчам.

Зьезду асабліва сур'ёзна трэба будзе абмеркаваць гэтае пытаньне, а таксама абгаварыць пытаньне аб перабудове арганізацыйнай структуры ніжэйшых зьвеньняў, у сувязі з ліквідацыяй округ.

Зьезду таксама прыдзецца вырашыць вялікарныя задачы далейшага ўзросту будаўніцтва па кантрольных лічбах на будучы год, паляпшэньня планаваньня будаўніцтва, шпаркага пашырэньня вытворчасьці будаўнічых матар'ялаў і выкананьня дырэктыў аб зьніжэньні сабекошту будаўнічых работ.

**КАВАЛЁЎ.**

## Ліквідаваць парушэньні выбарчага законадаўства

Прэзыдыум ЦВК БССР заслухаў даклад цэнтральнай выбарчай камісіі і садаклады Магілеўскага, Мазырскага і Менскага акрывыканкомаў аб выкананьні пастановы прэзыдыуму ЦВК наконт ліквідацыі парушэньняў выбарчага законадаўства.

Паводле даных пяці округ (Бабруйскай, Гомельскай, Полацкай, Віцебскай і Аршанскай) праверачнымі камісіямі адноўлена ў правах звыш 15.000 чалавек, што складае 25 проц. усіх пазбаўленых выбарчых правоў.

Па Менскай акрузе адноўлена ў выбарчых правах 4.720 чалавек.

Прэзыдыум ЦВК адзначыў, што вынікі праверкі сьпісаў пазбаўленых сьведчаць аб тым, што дырэктывы ўраду аб ліквідацыі парушэньняў выбарчага законадаўства былі правільныя і своячасовыя. Цэнтральная выбарчая камісія даручана распрацаваць праект пастаяннага вучоту лішэнцаў.

## Прывітаньне Савецкай Карэліі

**Намесьнік старшыні Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР тав. ХАЦКЕВІЧ ад імя прэзыдыуму ЦВК паслаў тэлеграму ЦВК Аўтаномнай Карэльскай ССР з прычыны 10-цігодзьдзя існаваньня Карэліі.**

**«Прэзыдыум ЦВК БССР горача вітае працоўных Савецкай Карэліі, якая, як і Савецкая Беларусь, зьяўляецца фарпостам Саюзу ССР на мяжы з капіталістычным сьветам. Толькі дзякуючы дыктатуры пралетарыяту і правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі, Савецкая Карэлія за 10 год дасягнула вялікіх посьпехаў ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Дасягненьні Савецкае Карэліі зьяўляюцца паказальнікам правільнага ленінскага вырашэньня нацыянальнага пытаньня, якое дало магчымасьць працоўным Карэліі, у цесным саюзе з усімі брацкімі савецкімі рэспублікамі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пераможна ажыцьцяўляць задачы сацыялістычнага будаўніцтва».**

—Кастрычніцкі РК КП(б)Б склікае 5-га жніўня г. г., а 6 гадз. веч. у клюбе Леніна (ст. Менск—пас.) нашыраны пленум РК

Парадак дня:

1. Вынікі выкананьня прамфінпляну па раёне;
2. Папярэднія вынікі аб перавыбарах фабкомаў;
3. Вынікі пераходу на 7 гадз. дзень на прадпрыемствах раёну.

На пленум павінны зьявіцца члены РК у абавязковым парадку і без спазьненьня, усе сакратары парткалектываў, ячэек і цэх. ячэек, старшыні ФЗМК, старшыні рэдкалегій насьценгазэт, дырэктары прадпрыемстваў і кіраўнікі ўстаноў—партыйцы.

ПАВІЛЬЁН ДРУКУ ЎСЕБЕЛАРУСКАЙ ВЫСТАЎКІ

## ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

**Сёньня, 2-га жніўня**

— **Мен. АК МОПР'у.** А 7 г. веч. адбудзецца насяджэньне рэвізійнай камісіі Мен. АК МОПР'у. Члены рэв. кам. павінны зьявіцца без спазьненьня.

**Заўтра, 3-га жніўня**

— **Клюб саўгандальспужачых** склікае арганізацыйны сход членаў драмгурткоў а 7 г. веч. у памяшк. клюбу. Адначасова запрашаюцца ўсе жадаючыя ўнуў часова запрашаюцца ўсе жадаючыя ўнуў запісацца ў драмгурткі. Просьба зьявіцца без спазьненьня.

— **Сад Асьветы.** Дармовы канцэрт Ліпоўскай Р. А. (драм. сапрано) для членаў саюзу асьветы. Пач. роўна а 10 членаў саюзу асьветы. Пач. роўна а 10 г. веч Білеты ў канц Дому Асьветы ад 11-2 і ад 6—9 г веч. У выпадку дрэннага надвор'я канцэрт пераносіцца ў Дом Асьветы.

**Ад Мен. АКК КП(б)Б**

Мен. АКК КП(б)Б просіць зьявіцца на пасяджэньне партгрупкі, якое адбудзецца 3 жніўня а 10 гадз. раніцы ў памяшканьні канцылярыі Мен. АКК КП(б)Б (Энгельса, 28) наступных таварышоў:

Мікуліча Д. К.—(яч. Аўтатрамвайнага кіраўніц.), Ланіча Т. П.—(яч. Аўтатрамвайнага кіраўніц.); Войтава Т. А. — (яч. фабр. «Прафінтэрн»), Ізох К. Р.— (яч. фабр. «Прафінтэрн»), Цяплоў П. Б.— (яч. гуты «Пралетары»), Ройданаўскі РК), Супкевіч А. А. — (яч. БСІКА), Бурак А. Ф. — (яч. гарсаўгасаў), Сівец В. В. — (зав. «Камінтэрн»), Яворскі Я. Я. — (яч. БСІКА), Бандарчук Д. Я. — (яч. 2 арт. Белпалка), Мац Д. Б. — (яч. гарсаўгасаў), Сарвер Я. П. — (яч. БСІКА), Жукоўскі Ф. В. — (яч. зав. «Пралетары»), Ваў- Ф. В. — (яч. зав. «Камінтэрн»), Засімчук С. Д. — (яч. Камвучок В. М., Літвін В. Л. — (яч. Камвуаў), Ластоўскі Я. — (яч. Белсельбанку), Радкевіч Я. А. — (Лагойскі р-н), Іофін С. М. — (яч. зав. «Камунар»), Юховіч Л. Я. — (яч. зав. «Камунар»), Люстэрнік Ш. Х. — (яч. зав. «Камунар»).

**Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.**

## Згублены і ўкрадзены дакументы

**лічыць несапраўднымі:**

Кант. кн. Якубоўскага П. М., выд. Мен. спаж. т-вам «Земляроб». 1535
Вайск. кн. Лазоўскага Ў. У., выд. 6 п. 1536
Бірж. карт. Кундар В. П., выд. Мен. бірж. працы. 1537
Пашп. Крэнь Н. А., выд. Лагойск. РВК. 1538
Вайск. біл. літ. «В» Хаменка Б. А., выд. лін. к-рай ст. Барэзіна Зах. чыг. 1539
Пашп. Рудэрмана Э. А., выд. Мен. міліцыяй. 1540
Дам. кн. № 32 ЖАКТУ № 19, выд. Мен. міліцыяй. 1541
Студ. пасьведч. № 68 Рэцько Я. К., выд. Белпадтэхнікумам. 1542
Даведка аб выбарч. правох Гільвіч З. Я., выд. Мен. міліцыяй. 1543
Вайск. біл. выд. Вабр. васпісматам, пасьведч. № 191, выд. медфакам ВДУ. Луканскага С. Я. 1544—1545
Студ. пасьведч. Ліса В. І., выд. Мен. подшпадтэхнікумам. 1546
Чл. б. сакузу працасьветы Галубовіча А. І. 1547
Пасьведч. Куракевіча Л. Л., выд. Мен. мутэхнікумам. 1548
Вуч.-конск. карт. № 1020 Гарошка С. Я., выд. Астр.-Гарадзецкім РВК. 1549
Пашп. Адохновіча П. І., выд. Ковднаўск. міліцыяй. 1550
Даведка аб выбарч. правох Лосева Я. Л., выд. Мен. міліцыяй. 1551
Вайск. кн. № 2358 Тарасаная Н. П., выд. Самахвал. РВК. 1552
Вуч.-конск. карт. Кучмела А. С. 1553
Канд. карт. № 41292 Астапонка Ф. М., выд. Мен. АК КП(б)Б. 1554
Асабов. пасьведч. № 12а Астапонка Ф. М., выд. 2 р-нам сл. цягі МВД чыг. 1555
Камсам. біл. — 99309 Крука А. П., выд. Мен. АК ЛКСМБ. 1556

## Чарговае пасяджэньне Беларускага штабу ў паход за паперу

**Сёньня, 2 жніўня, а 4-й гадз. дня ў памяшканьні рэдакцыі газэты «Зьвязда» адбудзецца чарговае пасяджэньне Беларускага штабу ў паход за паперу.**

**Яўка ўсіх членаў Беларускага штабу абавязкова.**

**Запрашаюцца т. т. КОФМАН (Белпаперабядманьне), КАЦ (культсэктар ЦСПСБ), ПЛЯТНЕЎ (ЦП саюзу саўгандальспужачых), НОТЭС (саюз друкароў).**

**ШТАБ**

# РАБКОРЫ ПІШУЦЬ

### Бяднячку ня прынялі ў калгас

Панцюк Натальля з вёскі **Бабунічы**, Петрыкаўскага раёну, Мазырскай акр., зьяўляецца бяднячкай. Падатку ня плаціць. У яе арганізацыі калгасу ў гэтай вёсцы, актыўна ўдзельнічала ў уцягненьні бедняноў у калгас і ў замацаваньні яго, а таксама актыўна ўдзельнічала ў раскулачваньні кулакоў. Яна зьяўляецца членам камсаолу, але ня гледзячы на гэта, калі яна падала заяву ў калгас «Чырвонае Палесьсе» аб прыёме яе ў члены калгасу, дык калгас ёй у прыёме адмовіў толькі таму, што Панцюк Натальля ў калгас здавала аднаго каня, бо больш у яе нічога ня было і яшчэ таму, што яна мае дрэнная здароўе.

Заяву Натальлі Панцюк патрэбна перагледзець і прыцягнуць да адказнасьці таварышоў, якія ня прымаюць беднякоў у калгас.

**А. Палескі**

### Калі-ж праваць умову?

Паміж **саўгасамі Канстантынава і Лучыцы**, Капаткевіцкага раёну, Мазырскае акругі была заключана умова па сацыялістычным спаборніцтве. Але ўжо многа часу прашло з тых пор, як заключылі ўмову, але рабачкомы гэтых саўгасаў чамусьці не правяраюць васколькі вы выканалі дагавор. Мабыць гэтым рабачкомам сацспаборніцтва зусім ня цікава.

**А. Пожня.**

### Кіраўнік не на месцы

При Кашыльскім райкалгассаюзе, Менскай акругі, месца трактарная калёна, якая існуе з 8 красавіка г. г. і налічвае 15 трактараў.

Загадчыкам гэтай калёнай узялі **Леаненава**, які ня можа кіраваць гэтай калёнай. Не хапае трактарыстых, трактары працуюць без нагрузак і месца шмат прастояў. Сярод трактарыстых заўважаюцца п'янкі, прагулы і г. д.

Райкалгассаюз не зварочвае на гэта ўвагі.

**Беспрацоўны трактар.**

### Сталоўка працуе кепска

Сталоўка «Камуна» № 2, якая знаходзіцца ў Рудзенску зусім кепска працуе.

Батракам, якія працуюць на сезоннай працы не хапае абеду. У сталоўцы панує антысанітарыя, абеды падаюцца разам з мухамі.

Праўленьне Сьмілавіцкага спажыўтаварыства павінна зацікавіцца працай сталоўкі.

**Рабкор.**

### КУРСАНТЫ ЦІП'у — У ЗАГОНЕ

У 1930 годзе скончылі ЦІП 300 тыльнікаўчыкоў і 289 каменшчыкаў, з якіх занята на пабудовах па сваёй кваліфікацыі: тынкаўшчыкоў 70%, каменшчыкаў — 7,5 проц., астатнія пасланы на чорную работу не па сваёй кваліфікацыі. Прычына гэтаму зусім простая. Гаспадарчыя арганізацыі ўпарта не жадаюць прымаць на работу ЦІП'аўцаў.

**ВЕДАЮЧЫ.**


Субота, 2-га жніўня **Сад Асьветы**
**Пастаноўка Маскоўскага дзяржаўнага тэатру „Синяя блуза"**
Білеты ў канц. Дому ад 11-2 і ад 6-10 гадзін увечары.
Пачатак роўна ў 8 гадзін увеч.
У выпадку дрэннага надвор'я пераносіцца ў Дом Асьветы

Кіно-тэатр „Культура" — **СЭВІЛЬ** бытавая драма ў 6 частках. **Зьвыш праграмы: ХРОНІКА № 27.** Пачатак сэансаў: 1—7 г., 2—9 г., 3—10 г. 30 м. Каса ад 5 гадз.

КІНО Інтэрнацыянал — **По прычыне посьпеху 2-гі тыдзень** нямецкі фільм **ДЗЕЛЯ ДЗІЦЯЦІ (КРЫВАПРЫСЯГА)** Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. 30 м. Каса—ад 5 г. 30 м.

КІНО Пралетары — МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ЗАКОН ГОР** Пачатак 1-га сэансу а 7 г. Каса адкрыта з 5 г.

КІНО-САД — ВЫКЛЮЧНЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **Мачыха Шаманашвілі** драма ў 6 частках. Пачатак 1 сэансу а 10 гадз. Каса адкрыта з 6 г. 30 м.

КІНО „СПАРТАК" — ВЫДАТНЫ БЫТАВЫ ФІЛЬМ **ЛЯСНЫ ЗЬВЕР** драма ў 9 част. Пачатак 1 сэансу—**а 7 гадз.**, 2—**9 гадз.** 3 сэансу—**11 гадз.** Каса—**ад 6 гадз.**

**РАГАЧОЎСКАЯ ПРАФТЭХШКОЛА ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ**
ПАВЕДАМЛЯЕ:
ПРЫЁМ У ПРАФШКОЛУ **працягнут да 30 жніўня**
Прымаюцца скончыўшыя сямігодку.
Вучні забясьпечваюцца 60 проц. стыпэндыяй і інтэрнатам

**ЗАОЧНЫЯ БУХГАЛЬТАРСКІЯ КУРСЫ**
Прыём слухачоў праводзіцца круглы год.
Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьветай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі.
ПЛАТА ЗА КУРС 33 руб.
праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, з якіх 4 руб. залічваюцца за 8-ы месяц і па 4 руб. на пралягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца
Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць на адрасе: **Менск, пошта, скрыньна 44, Заочным курсам.**
На адказ прыкладаць 2 маркі па 10 кап.

**ПОЛАЦКАЙ ПРАФШКОЛЕ** агнятрывалага будаўніцтва
**патрэбен інжынэр-будаўнік-тэхналёг**
на загадваньне майстэрнямі і выкладаньне будаўнічага мастацтва і тэхналёгіі.
**Аплата па нагрузцы ад 350 да 450 руб.**
Заявы з дакумантамі і водзывамі аб працы накіроўваць па адрасе: г. Полацак, Ленінская, 48. Прафшкола.

У зьвязку з 1-й Усебеларускай Выстаўкай сельскай гаспадаркі і прамысловасьці
арганізуецца адначасова
**ВЫСТАЎКА „ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА БССР за 10 год"**
**(карціны, графіка, скульптура, архітэктура, самадзейнае мастацтва).**
Галоўмастацтва НКА БССР і выставачны камітэт гэтай выстаўкі просіць адпаведныя арганізацыі, якія маюць мастацкія творы, а таксама паасобных мастакоў і грамадзян запамагчы ў арганізацыі выстаўкі: **даць веснкі аб гэтых творах і надасласць іх у адрас БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА МУЗЭЮ** (Цэнтральны Дом Селяніна, тэл. 3-83).
Экспанаты прымаюцца ў музэі з 12 да 2 гадз. дня тав. **Вяржбіцкім.**
Пажадана, каб пасылаемыя творы або вдбівалі будаўніцтва БССР за апошнае 10-годзьдзе, або найбольш характарызавалі-б творчы твар мастака. Будаўнічыя і будуючыя арганізацыі БССР і паасобныя архітэктары і будаўнікі могуць здаваць свае экспанаты таксама і члену выстаўкому—архітэктару ЛАЎРОВУ (Наркамасьветы. Пляц Волі, 2-гі паверх, пакой № 13).
**Апошні тэрмін здачы або прысылкі экспанатаў 5-га жніўня.**
**ГАЛОЎМАСТАЦТВА НКА БССР.**
**КАМІТЭТ ВЫСТАЎКІ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА БССР за 10 год.**

**ЛЯЧЭБНІЦА** — МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА КАМІТЭТУ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская, № 25, побач з 2-м Домам Саветаў,
**АДКРЫТА ад 9 гадз. ран. да 9 г. веч.**
**Прыём хворых па ўсіх спэцыяльнасьцях:**
на ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцкіх, нэрвовых.
Электра-сьвета-лячэньне і кварц адкрыты з 11—2 гадз. дня і 5—8 гадз. увеч.
Рэнтген (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 6 г. да 8 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. веч. штодзённа
Кансультацыя прафэсароў па ўсіх спэцыяльнасьцях на папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запісь з 9 гадз. раніцы да 9 гадз. веч.
**Прыём хворых па лекавых кніжках камітэту Для ўсіх іншых грамадзян за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.**

**Правілы прыёму ў Барысаўскую прафтэхшколу будаўнікоў**
Заявы аб паступленьні прымаюцца з 20 ліпеня да 1-га верасьня. Заявы падаюцца на імя прыймовай камісіі школы.
Да заявы далучаюцца наступныя дакументы:
а) аб узросьце,
б) аб асьвеце,
в) медычнае пасьведчаньне аб стане здароўя,
г) даведка аб сацыяльным і матар'яльным становішчы,
д) даведка аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў,
е) анкета засьведчаная прафсаюзнымі або сацыяльнымі арганізацыямі.
УВАГА: 1) Ніякія копіі дакумантаў не прымаюцца.
2) Да заявы необходна прыклясьці паштовых марак на 20 к. для адказу пазьдзей заяў.
Узрост паступаючага павінен быць ня ніжэй 14 гадоў і ня вышэй 18 гадоў.
У прафшколу прымаюцца асобы, якія скончылі 4 групы 7-гадовай школы, або адпаведныя гэтаму курсу іншыя навуч. установы.
Пры Барысаўскай прафшколе існуюць 2 цэхі: каменна-мучны і сталярны.
Курс прафшколы разьлічан на 3 гады.
Перавага пры прыёме дзецца дзецям рабочых адпаведных спэцыяльнасьцяй і калгасьнікаў.
**Прафтэхшкола.**

**ВЫШАЎ з ДРУКУ, разасланы падпісчыкам і паступіў у продаж**
**„ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК"**
**ОРГАН ЦК КП(б)Б**
**№ 9-10 за ЛІПЕНЬ месяц № 9-10**
ЗЬМЕСТ:
ПЕРАДАВАЯ.—Па шляху Леніна.
Партыйнае будаўніцтва.
ПАРТЫЕЦ.—Хутчэй перабудаваецца.
Г. ШПЭКТАРАЎ.—Аб выніках перавыбараў нізавых парторгаваў і некаторых чарговых задачах.
За калектывізацыю.
М.—Рыхтаваецца да ўборкі ўраджаю.
ПРАКОПЧЫК.—Выпраўленьне памылак і тэмпы калектывізацыі
БУРАВА.—Масавая работа сярод сялянак.
М. ЛАБАДАЕЎ.—Аб рабоце з вясковай беднатой.
На асобных вучастках работы.
ДУНЕЦ.—Правы ўхіл і «левы» загіб у ня́рабоце.
САЛДАЦЕНКА.—Нататкі з жыцьця калгасных і вясковых ячэек.
Агітацыя і прапаганда.
Е. ШЧАРБАКОЎ.—Кіраўніцтва работай у галіне народнай асьветы і агульнакультурнага будаўніцтва.
Партыйная вучоба.
Мэтадычныя распрацоўкі. (Для кіраўнікоў палітграматы і прадметных гурткоў на выніках XIII зьезду КП(б)Б).
Прыкладныя вучэбныя планы. (Для курсаў перападрыхтоўкі партактыву).
Бібліяграфія.
**Кошт асобнага нумару 25 кап.**
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 м-ц —25 кап. | На 6 м-цаў—1 р. 50 кап.
„ 3 м-цы—75 кап. | „ 1 год—2 р. 75 кап.
Кожная гарадзкая і вясковая партыйная і камсамольская ячэйка, кожны агітатар, прапагандысты, кахаты, групаны і зьвеньявы арганізатар, кожны партыйны актывісты павінен падпісацца на часопіс «ПАРТЫЙНЫ РАБОТНІК».
**ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: Галоўнай Канторай газэты „ЗЬВЯЗДА" (МЕНСК, Савецкая, 63), усімі паштовымі канторамі, лістаносцамі і спэцыяльнымі ўпаўнаважанымі**

**Да ведама ўсіх кліентаў Дзяржбанку**
Праўленьне Дзяржаўнага Банку, на аснове п. 3 пастановы СНК СССР ад 26 ліпеня 1930 г. аб ліквідацыі, у сувязі з кредытнай рэформай, узаемнай запазычанасьці па водпуску тавараў і аказаньні паслуг у кредыт паміж дзяржорганамі, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку і каапэрацыйнымі зьмешанымі акцыянэрнымі таварыствамі бяз удзелу замежнага капіталу («Известия ЦИК» № 205 ад 27 ліпеня 1930 г.), гэтым абвяшчае, што устаноўленыя ў п. п. «б» і «в» арт. 1 паказанай пастановы тэрміны ў выпадку знаходжаньня аднаго з бакоў (крэдытор або дэбітор) у адной з паказаных ніжэй аддаленых мясцовасьцяй Саюзу ССР працягваюцца на наступныя тэрміны: у межах Якуціі на 30 дзён, сярэдняй Азіі — 20, Далёкага Ўсходу — 30, Усьць-Сысольскай акр. і Зыранскай вобл.—15, Казакстану — 15, Бурата-Манголіі — 10, Іркуцкай, Краснаярскай, Томскай і Енісейскай округ Сібіры — па 10. Паказаны для Далёкага Ўсходу тэрміны дзейны і па разрахунках унутры краю паміж Сахалінам, Камчаткай і інш. акругамі краю. Пастанова СНК СССР ад 26 ліпеня 1930 г. пашыраецца на ўсе паказаныя віды запазычанасьці незалежна ад іх тэрмінаў і формы, у тым ліку і на авансы; не пашыраецца на запазычанасьць па перадачы асноўных маемасных фондаў і інш. віды запазычанасьці, якія на вынікаюць са зьдзелак па продажы тавару і паслуг. Згодна п. 2 паказанай пастановы, яна не пашыраецца: на арганізацыі, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэце, на тых крэдытораў і дэбіторaў, захаваньне якіх на балянсе кліентаў дапускаецца па ўзгадненьні Дзяржбанку з ведамсткамі (напрыклад, па авансах будаўнічым арганізацыям — загад ВСНГ СССР ад 24 лютага 1930 г. № 888, інструкцыя па правядзеньні крэдытнай рэформы на спажыўкаапэрацыі ад 26 лютага 1930 году і інш.), на дэбіторaў і крэдыторaў, якія ня маюць контакарэнтнага рахунку ў адным з банкаў, на дэбіторaў, якія зьвернуты да ліквідацыі ва устаноўленым парадку. Дэбіторы, якія паслалі свае супярэчнасьці па запатрабаваньне крэдыторaў да правядзеньня ў дзейнасьць пастановы ўраду абавязаны паведаміць іх у копіі банкам не пазьней 5 жніўня. Пры прадстаўленьні запатрабаваньняў крэдыторы паказваюць нумары сваіх контакарэнтных рахункаў і па магчымасьці нумары рахункаў дэбіторaў. Крэдыторы могуць замест копіі выпіскі з рахунку дэбіторaў, якая прадугледжана п. «а» арт. 1 пастановы, абмежавацца прадстаўленьнем банкам выпісак толькі разьмеру сальдо, якое выводзіцца у іх карысьць.

**БЕЛАРУСКІ РАДЫЁ-ЦЭНТР**
абвяшчае
**КОНКУРСНЫ ПРЫЁМ ДЫКТАРОЎ**
на менскую радыё-вяшчальную станцыю імя СНК БССР
Умовы: элементарна-палітычная пісьменнасьць, добрае веданьне беларускай мовы, уменьне добра чытаць па друкаваным і пісаным на бел. мове.
Асобы, якія жадаюць паступіць у якасьці дыктараў, павінны падаць не пазьней 12 жніўня г. г. заяву ў Беларадыёцэнтр, Унівэрсытэцкая, 16.

**ПАТРЭБНЫ ПАКОІ** для прыяжджаючых пэдагогаў Белдзяржмуэтэхнікуму
Прапановы накіроўваць на адрасе: Унівэрсытэцкая № 45, т. Петроўу, штодзённа ад 11 да 2 г. дня.

ТЭАТРУ „СІНЯЯ БЛУЗА" саюзу сельгаслесарабочых **ПАТРЭБНЫ сіняблузьнікі** мужчыны і жанчыны
Прыймовыя іспыты на сцэне Дому Селяніна 2, 3 і 4 жніўня ад 12 да 2 г. Аклад 70 руб.

**Прадаюцца БОЧКІ** ад друкарскай фарбы і шклянымі БАЛЁНЫ з-пад кісаты
Зварачацца да заг. гаспадарай Выдавецтва «Зьвязда», Савецкая, 63.

**АД'ЯЖДЖАЮЧЫ Ў ВОДПУСК** удзел рэдакцыі, на курорт, **атрымлівайце** газ. **„ЗЬВЯЗДА"** на месцы знаходжаньня ў водпуску, заведамішы ў адрас падпіскі газ. «ЗЬВЯЗДА» **ВАШ НОВЫ АДРАС.**


Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2